СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.52, 17.51, 10.59;
Віцебск — 6.44, 17.40, 10.56;
Магілёў — 6.41, 17.41, 11.00;
Гомель — 6.35, 17.42, 11.07;
Гродна — 7.05, 18.09, 11.04;
Брэст — 7.06, 18.09, 11.03.

МЕСЯЦ:
Маладзік 4 сакавіка.

ІМІНІНЫ
Архіпа, Халімона, Максіма, Хвядота, Яўгена, Макара; Казіміра, Люцыі.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

4 САКАВІКА 1992 г.
серада, № 46 (21824)

ВОЗГАЛАС

...І ВЫЙСЦІ З ІСКАМ У СУД НА ЎРАД

«Лічыць спыненне вытворчасці ВА «Гомсельмаш» надзвычайным здарэннем. Асудзіць бяздзейнасць уласніка прадпрыемства — Савета Міністраў РБ і яго органаў, пакінуўшых без работы 29-тысячны калектыў аб'яднання. Патрабаваць ад урада рэспублікі прыняцця неадкладных мер па забеспячэнню работы ВА «Гомсельмаш».

Так гучыць першы пункт пастановы прэзідыума Рэспубліканскага савета прафсаюза работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудавання рэспублікі. У ёй таксама калектыву рэкамендуецца распрацаваць праграмы выжывання і абароны ад беспрацоўя, разгледзець пытанне арганізацыі работы на ўмовах новых форм уласнасці, стварыць страхавы фонд. Разам з тым, выйсці з іскам у народны суд на Савет Міністраў, як уласніка прадпрыемства, які не забяспечвае яго нармальнай работы; выставіць патрабаванне да ўрада, каб ён выдзеліў крэдыт для выплаты кампенсацыі за прастоі, якая прадугледжваецца ў размеры сярэдняга заработку, з наступным пагашэннем гэтага крэдыту за кошт падаткаў прадпрыемства...

У сувязі з гэтай пастановай варта заўважыць: у суд на ўрад, вядома, падаць можна. Але толькі за тое, што ён поўнасцю не адпусціў аб'яднанне на вольны хлеб. Хоць бы дзеля таго, каб тут да канца зразумелі: хопіць разлічваць, як раней, на некага зверху, трэба пракладваць да рынку самастойную дарогу. Вельмі сумна, але сёння не толькі «Гомсельмаш», а многія блукаюць па рыначнай бездаражы, прычым без асаблівых намаганняў выйсці на цвёрды шлях. І той жа ўрад з гэтай прычыны можна было б засудзіць шмат разоў. Хоць спачатку варта паставіць пытанне: а ці ўсё зроблена самімі?

Кар. «Звязды».

З МІСІЯЙ МІЛАСЭРНАСЦІ

Наташа нарадзілася ў Пінскім раёне ў 1937 годзе. У час Вялікай Айчыннай вайны разам з бацькамі была вывезена ў Германію. Пасля вайны аказалася ў Швецыі, выйшла замуж, стала пані Андэрсан.

Дабрачыннай дзейнасцю займаецца даўно. Да сябе, у Швецыю, на працягу многіх гадоў на канікулы запрашала ў аздараўленчы лагер, створаны на сваёй сядзібе, школьнікаў з Польшчы. Фізкультура, гульні, турыстычныя паходы ў лес і наваколлі, чыстыя прадукты харчавання даюць дзецям за месяц добры адпачынак, умацоўваюць іх здароўе.

У сувязі з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС у Наташы Андэрсан з'явілася думка запрасіць дзяцей з найбольш пацярпеўшых абласцей Рэспублікі Беларусь і Расіі.

Каб ажыццявіць гэту ідэю, яна закончыла курсы рускай мовы і ў суправаджэнні шведскай журналісткі Эвы Цывель-Росен і другога сакратара пасольства Расіі ў Швецыі Д. Агіеўскага наведала нашу рэспубліку. Яны пабывалі ў 30-кіламетровай зоне, Нараўлянскім і Рэчыцкім лясгасах. Сустракаліся з дзецьмі і іх бацькамі, якія працуюць на лясных прадпрыемствах.

Старшыня абласнога прафсаюза работнікаў лесу Н. Шалютай і генеральны дырэктар Гомельскага ВЛГА Б. Анішчанка дамовіліся з Наташай Андэрсан аб падрыхтоўцы дзвюх груп па 30 дзяцей работнікаў лясных прадпрыемстваў для адпраўкі ў Швецыю ў час летніх канікулаў.

У. БАРАДЗІН,
намеснік начальніка навукова-тэхнічнага ўпраўлення Мінлясгаса РБ.

ВЫТВОРЧАСЦЬ ПАДАЕ, БЕСПРАЦОЎЕ РАСЦЕ

БАРЫСАЎ (К. Яраш). На 20 з 32 прамысловых прадпрыемстваў Барысава назіраецца рэзкі спад аб'ёмаў вытворчасці. Катастрафічная сітуацыя склалася на прадпрыемствах харчовай прамысловасці, у прыватнасці, на малочным і мясакамбінатах. Са значнымі перабоямі працуюць прадпрыемствы машынабудавання.

У асабліва цяжкім становішчы апынуліся буйнейшыя з іх. Заводы аўтатрактарнага электраабсталявання і «Аўтагідраўзмацняльнік» перайшлі на няпоўны рабочы тыдзень. Галоўная прычына падзення аб'ёмаў вытворчасці — у адсутнасці сыравіны. Многія прадпрыемствы Барысава знаходзяцца ў поўнай залежнасці ад пастаўшчыкоў сыравіны з-за межаў Беларусі. Дагавораў паміж пастаўшчыкамі і спажыўцамі ў гэтым годзе няма. Нягледзячы на пагадненні, заключаныя паміж краінамі СНД, становішча ў прамысловасці працягвае пагаршацца. Гэта значыць, што і ў далейшым прадпрыемствам пагражае падзенне аб'ёмаў вытворчасці, а работнікам — беспрацоўе. Ужо сёння кіраўнікі прадпрыемстваў у горадзе вядуць размову аб скарачэнні ў прамысловасці да 300 рабочых месц.

Загадкавае? Неверагоднае? Фантастычнае?

Не, рэальнае. Паглядзіце на здымак, паважаныя чытачы, і вы пераканаецеся ў гэтым. «Лопата для кемпинга»— так называецца выраб. Так што калі ў вас ёсць кемпінг, то толькі такой «лопаты» за 1.405 рублёў і 8 капеек вам для поўнага шчасця і не хапае.

Гэты імпартны цуд прадаецца ў мінскім магазіне «1000 дробязей». Канешне, добра, што ўладальнікі кемпінгаў «за бугром» клапоцяцца пра нашых уладальнікаў кемпінгаў, як пісалі раней, на практыцы праяўляюць класавую салідарнасць. Але з такой нагоды ў простага, змардаванага жыццём і дэфіцытам усё яшчэ савецкага чалавека ўзнікае шэраг пытанняў. Якому нашаму гандлёваму мудрацу прыйшла ў галаву такая «геніяльная» думка патраціць валюту, якой катастрафічна не хапае на лекі інвалідам і чарнобыльцам, на такі тавар? Што, за мяжой больш нічога патрэбнага нам няма? А можа расплаціліся бартэрам—халадзільнікамі ды тэлевізарамі, ад якіх у нас паліцы магазінаў трашчаць?

Каментарый да гэтага факта зрабіў адзін з наведвальнікаў магазіна: «Прыкра, што такой лялечнай «лопатой» нават магілу нельга выкапаць аўтарам ідэй».

Не вельмі дыпламатычна, грубавата. Але справядліва.

М. БАЛАШОЎ.
Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ПІСЬМО З КАМЕНТАРЫЕМ

СПРЭЧНАЯ КАМПЕНСАЦЫЯ

Паважаная рэдакцыя! Цяпер на розных узроўнях шмат гаворыцца аб кампенсацыйных выплатах сем'ям з невысокай зарплатай. І мы ўвогуле задаволены такім падыходам урада да гэтых праблем. Але, здаецца, на месцах не спяшаюцца выконваць пастановы вышэйшых начальнікаў. Міркуйце самі. Савет Міністраў рэспублікі прыняў пастанову аб штомесячных выплатах на харчаванне не менш васьмі рублёў на чалавека. А ў дзіцячым садзе № 440 г. Мінска яна не выконваецца ў адносінах да нянек і іншых менш аплачваемых работнікаў. Выплаты тут робяць з разліку 20 працэнтаў ад зарплаты. І розніца паміж тым, што атрымлівае загадчыца і нянечка, істотная. Гэта тым больш дзіўна, што харчуюцца яны за адным сталом і апетыт у іх аднолькавы.

(Са звароту ў рэдакцыю работніц дзіцячага сада № 440 г. Мінска).

НАШ КАМЕНТАРЫЙ. Вядома, у дашкольнай установе склалася неадназначная сітуацыя. Простым вокам відаць, што тут па-свойму зразумелі распараджэнне ўрада і паспрабавалі яго адкарэкціраваць. Але чаму? З такім пытаннем мы звярнуліся да галоўнага бухгалтара Фрунзенскага РАНА г. Мінска Т. Зянкевіч. І пачулі ў адказ, што ўсё зроблена правільна: яна кіравалася пастановай № 460 Мінскага гарвыканкома ад 30 снежня 1991 года. У пункце 12 гэтага дакумента гаворыцца аб неабходнасці ўстанавіць штомесячныя кампенсацыйныя выплаты ў сувязі з падаражаннем харчавання работнікам устаноў сацыяльнай культурнай сферы, ветэрынарнай службы, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і інш., фінансуемых з бюджэту горада, у суме 20 працэнтаў ад аклада па асноўным месцы работы.

Сапраўды, калі падыходзіць фармальна да гэтага дакумента, то ў РАНА паступілі правільна. Пастанова гарвыканкома прынята раней, чым з'явіліся ўрадавыя рэкамендацыі. Але ж тут не маглі не ведаць, што ўрад увёў мінімальныя кампенсацыі не менш васьмі рублёў на чалавека. Нянечкі дзіцячага сада атрымліваюць значна менш. І можна было падкарэкціраваць дакумент гарадскіх улад, ці ўзняць хоць бы пытанне аб узнікшай недарэчнасці перад вышэйшымі кіраўнікамі.

А што думаюць на гэты конт у гарвыканкоме? Намеснік старшыні А. Сасноўскі выдзеліў тры зыходныя пункты адліку. Па-першае, пастанова гарадскіх улад прынята раней, чым вызначылася пазіцыя ўрада, і яны зыходзілі з таго, што ўвядзенне нейкай канкрэтнай сумы выплат у час інфляцыі можа звесці іх да нуля. А працэнт ад аклада, якія будуць расці, дапаможа хоць неяк абараніць працуючых у сацыяльнай сферы. Па-другое, 20 працэнтаў — гэта выплата не толькі на харчаванне, а мера сацыяльнай абароны ў сувязі з пагаршаючымся ўзроўнем жыцця. І асаблівую ўвагу акцэнтаваў А. Сасноўскі на тым, што ўжо настаў час адмаўляцца ад ураўнілаўкі. Той, хто лепш працуе, займае больш актыўную жыццёвую пазіцыю, бярэ на сябе адказнасць за калектыў і справы ў ім, павінен адчуваць і большыя клопаты з боку дзяржавы. Але адначасова кіраўнік не выключыў, што ў будучым яны вернуцца да вышэйпамянёнай пастановы і, магчыма, перагледзяць яе.

Вядома, довады А. Сасноўскага даволі слушныя. Аднак наўрад ці можна пагадзіцца з тым, што вырашэнне гэтага пытання дапускае адтэрміноўку. Бо нішто не перашкаджае прывесці пастанову гарвыканкома ў адпаведнасць з урадавай. Ды і элементарная павага да рашэння вышэйшага органа абавязвае гэта зрабіць як мага раней.

Мікалай БАЖКО.

ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАННЕ

З прыёмам у члены ААН Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана, паўнапраўнымі членамі гэтай найбольш аўтарытэтнай міжнароднай міжурадавай арганізацыі сталі ўсе ўдзельнікі нядаўна створанай Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Аб гэтым заявіў пастаянны прадстаўнік Украіны пры ААН Генадзь Удавенка, які выступіў у генеральнай асамблеі з выпадку прыёму новых членаў супольніцтва нацый ад імя Беларусі, Расіі і Украіны.

ТОЛЬКІ Ў ДУБАЎЦАХ!

ВАЎКАВЫСК (Б. Пракопчык). Цяпер, калі вытворчасць рэзка скарачаецца і вакол кожнага вытворцы круцяцца дзесяткі пасрэднікаў, з'яўленне новага прадпрыемства здаецца сапраўдным цудам. Адно з іх абласныя ўлады і прапанавалі ўвазе прэсы — гэта цэх сантэхабсталявання, які размясціўся ў вёсцы Дубаўцы і будзе саставной часткай Ваўкавыскага міжгаспадарчага цэментнага завода. Ванны, умывальнікі, унітазы — каля 120 розных прэс-форм мяркуецца выкарыстоўваць для вырабу гэтай і іншай прадукцыі. Падобнай вытворчасці (абсталяванне паставіла амерыканская фірма «Грубер», а мантажом кіраваў яе прадстаўнік Кенат Стар) у рэспубліках былога СССР няма. Адметна тое, што цэх будзе працаваць у асноўным на мясцовай сыравіне. Праўда, спецыфіка вытворчасці прадугледжвае шмат ручной працы, а значыць і цана вырабаў будзе саліднай.

УСТАНОЎЛЕНЫ ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ

Пагадненне аб устанаўленні дыпламатычных адносін і консульскую канвенцыю падпісалі 2 сакавіка ў Варшаве міністр замежных спраў Рэспублікі Польшча Кшыштаф Скубішэўскі і міністр замежных спраў Беларусі Пётр Краўчанка, які знаходзіцца тут з аднадзённым афіцыяльным візітам.

Прымаючы кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Беларусі, прэзідэнт Польшчы Лех Валенса звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць умацавання прыгранічных кантактаў паміж дзвюма краінамі, што, паводле яго слоў, раўназначна стварэнню ўмоў свабоднага перамяшчэння для беларускай меншасці ў Польшчы і польскай у Беларусі.

Праблемы этнічных палякаў і беларусаў, якія пражываюць па абодва бакі граніцы, закраналіся таксама ў час гутаркі П. Краўчанкі з прэм'ер-міністрам Янам Альшэўскім і міністрам замежных спраў Кшыштафам Скубішэўскім, кіраўніцтвам польскага сейма і сената.

БОГАСЛУЖЭННЕ— НА РОДНАЙ МОВЕ

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч 2 сакавіка прыняў Высокапрасвяшчэннага Мікалая, мітрапаліта Беларускай аўтакефальнай царквы, які прыбыў з Таронта ў Мінск. Разам з ім у гутарцы прынялі ўдзел члены дэлегацыі Васіль Русак і дырэктар Канадскага дабрачыннага фонду ахвяр Чарнобыля Мікалай Ганько.

Кіраўнік дэлегацыі расказаў аб дзейнасці Беларускай аўтакефальнай царквы, звярнуў увагу на тое, што ў суверэннай дзяржаве павінна быць свая нацыянальная царква, якая вяла б богаслужэнне на роднай мове. Таму, на яго думку, неабходна, каб у каталіцкіх касцёлах і праваслаўных цэрквах гучала не польская і руская мова, а толькі беларуская.

Станіслаў Шушкевіч з разуменнем аднёсся да пажадання госця, адзначыўшы ў той жа час, што дзяржава не мае намеру ўмешвацца ў справы розных канфесій. Абодва бакі гаварылі аб неабходнасці ўзаемнага супрацоўніцтва дзеючай у рэспубліцы і за мяжой Беларускай царквы.

У час гутаркі абмяркоўваліся пытанні магчымага абмену студэнтамі, гаварылася аб неабходнасці хутчэйшага адкрыцця ў Канадзе і Злучаных Штатах консульстваў, што дасць магчымасць беларусам, якія жывуць за мяжой, аказваць больш дзейсную матэрыяльную і духоўную дапамогу рэспубліцы.

ІНШАГА ВЫЙСЦЯ НЯМА

Хочацца выкласці некалькі контраргументаў апаментам ідэі рэферэндуму, у прыватнасці, дэпутату РБ Уладзіміру Станкевічу, які нядаўна выказаў свае думкі на старонках «Звязды».

Беларусь сёння атрымала яшчэ адзін, магчыма, апошні гістарычны шанц вярнуцца ў сям'ю еўрапейскіх, цывілізаваных краін у якасці незалежнай, дэмакратычнай дзяржавы з рыначнай эканомікай і рэфармаванай, згодна з сусветнымі нормамі, сістэмай улады. Але мы бачым, як гэты шанц недаравальна марнуецца сённяшнім кіраўніцтвам рэспублікі — праяўляецца «хвасцізм» у станаўленні дзяржаўнасці, адбываецца імітацыя пераходу да рынку, адцягваецца рэформа заканадаўчых і выканаўчых органаў улады, пакрываюцца «дзікая» прыватызацыя і сабатаж зямельнай рэформы.

Разам з тым у большасці насельніцтва пад уздзеяннем падзей у суседняй Расіі сённяшняе цяжкае становішча асацыіруецца з прыходам да ўлады новых, дэмакратычных сіл. Хоць на самай справе ні ў Расіі, ні тым больш у Беларусі рэальнай змены ні заканадаўчай, ні выканаўчай улады не адбылося — ва ўсіх гэтых структурах засталіся тыя самыя стаўленікі камуністычнай наменклатуры. Знешне перафарбаваўшыся, яны захавалі не толькі бюракратычна-размеркавальны светапогляд, але і ценявую сістэму карпаратыўных сувязей партыйнай наменклатуры па вертыкалі і гарызанталі, ахапіўшую ўсю рэспубліку і захоўваемую, нягледзячы на закрыццё камуністычных цэнтраў. Пры наяўнасці практычна некранутай ураўняльнай псіхалогіі, патэнцыяльна камуністычнай па сваёй сутнасці, прывітай народу пад час «сацыялістычнага будаўніцтва», неакамуністы маюць пэўны шанц вярнуць частку страчанага аўтарытэту ў выпадку далейшага абвастрэння сацыяльна-эканамічнага крызісу. Безумоўна, што на іх «працуе» і антырыначны па сваёй сутнасці і камуністычны па саставу ўрад Кебіча, які сваёй бяздзейнасцю і некампетэнтнасцю можа вычарпаць спадзяванні народа на рыначныя рэформы як сродак аднаўлення эканомікі.

У гэтых умовах праціўнікі рэферэндуму прадказваюць у выніку яго правядзення анархію, абвастрэнне палітычнага процістаяння, некіруемасць выканаўчай улады і спыненне эканамічных рэформ. Можна нават пачуць, што нібыта сыдуць нанішто замежная дапамога і міжнароднае прызнанне Беларусі. Але ж ці так гэта на самай справе?

І анархія, вакханалія ў дзяржаўных структурах, і абвастрэнне палітычнай барацьбы як вынік агоніі, некампетэнтнасці, недасведчанасці сённяшняга кіраўніцтва Беларусі, і аморфнасць, бяздзейнасць аджыўшых свой час савецкіх структур, і поўная адсутнасць элементарных рыначных падыходаў, зрухаў, сур'ёзнай канцэпцыі эканамічных рэформ існуюць ужо зараз, яшчэ да правядзення рэферэндуму. Што ж датычыцца замежных інвестыцый, то Захад сур'ёзна намі зацікавіцца толькі пры радыкальных, рашучых захадах па рэфармаванню эканомікі, пры неабарачальнасці дэмакратычных пераўтварэнняў.

Супярэчліва выглядаюць спадзяванні дэпутата РБ У. Станкевіча на рэарганізацыю Вярхоўнага Савета, нават калі ўявіць, што яе ўдасца правесці. Не гаворачы ўжо аб тым, што састаў рэарганізаванага, «малога» ВС не будзе лепшым за ўвесь Вярхоўны Савет. Яго законы, тым больш добрыя, не будуць ажыццяўляцца з-за скрытага супраціўлення рыначным рэформам на месцах з боку пракамуністычных па свайму саставу выбарных і выканаўчых органаў, адміністрацыйна-вытворчай бюракратыі. Каб перадолець гэты сабатаж, трэба правесці дэсаветызацыю мясцовай улады, але гэты Вярхоўны Савет на яе не пойдзе, таму што большасць яго дэпутатаў так ці інакш матэрыяльна залежыць ад мясцовых савецкіх органаў, не гаворачы ўжо пра Саўмін. Таму рэформу мясцовай улады зможа правесці толькі новы, незалежны ад яе прафесіянальны парламент.

У. Станкевіч прапануе, пакінуўшы стары Вярхоўны Савет, замяніць толькі выканаўчую ўладу. Але ж без яе структурнай, кардынальнай рэформы гэта будзе азначаць адно — умацаванне аўтарытарнага рэжыму, а магчыма, і пераход да дыктатуры. Самі па сабе выканаўчыя органы на месцах бяссільныя, таму яны будуць імкнуцца выкарыстаць праваахоўныя органы ў якасці рычагоў улады. Дазволіць выканаўчым органам перайсці да сілавога рэжыму ў сённяшніх умовах — значыць, адкрыць шлях да аднаўлення адміністрацыйна-размеркавальнай сістэмы.

Асобна трэба спыніцца на аргументах У. Станкевіча супраць новага Закона аб выбарах, прапанаванага апазіцыяй БНФ. Можна згадзіцца з тым, што сапраўднай многапартыйнасці, здольнай стаць асновай прадстаўнічай улады, у нас яшчэ няма, але ва ўсіх краінах, пераходзячых да дэмакратыі,— Нямеччыне і Японіі, Іспаніі і Партугаліі, Польшчы і Чэха-Славакіі — партыі таксама спачатку знаходзіліся ў эмбрыянальным стане. Менавіта выбары былі для іх сродкам станаўлення. Таму новыя выбары на многапартыйнай аснове якраз і будуць ініцыіраваць сапраўдную многапартыйнасць, бо штучнае яе стварэнне ніколі не дасць плёну, ды і часу на гэта зусім няма.

РЭФЕРЭНДУМ: «ЗА» І «СУПРАЦЬ»

Разам з тым, якраз партыйная база, партыйны кантроль за дэпутатамі павысяць іх адказнасць у сваёй дзейнасці.

І ўжо зусім недарэчнай з'яўляецца прапанова У. Станкевіча аб уваходжанні дэпутатаў ад апазіцыі БНФ ва ўрад Кебіча. Справа ў тым, што ўсе краіны, пачынаючы эканамічныя рэформы, рабілі гэта пасля кансалідацыі ўлады. У Беларусі такая кансалідацыя можа адбыцца толькі пасля новых выбараў і стварэння сапраўднага кааліцыйнага ўрада, які адпавядаў бы раскладцы сіл у парламенце (Сойме). Штучнае ж аб'яднанне ў адной камандзе людзей з дыяметральна процілеглымі поглядамі не дасць выніку, бо сімбіёз рыначных і адміністрацыйных падыходаў у канцэпцыі такога ўрада толькі нашкодзіць эканоміцы рэспублікі.

Што ж датычыцца кансультацыйнай формы рэферэндуму, як яе вызначае У. Станкевіч, то актуальнасць рэферэндуму нават ад гэтага не зменшаецца. Пры станоўчым адказе большасці беларускага народа аб датэрміновым роспуску Вярхоўнага Савета ігнараванне думкі нацыі для парламента будзе не толькі маральным самазабойствам, але і фактычным благаславеннем на стварэнне альтэрнатыўных, паралельных структур улады. Будзем спадзявацца, што да апошняга справа не дойдзе і наш рыходны Вярхоўны Савет былой БССР здолее з гонарам спыніць сваю місію.

Зміцер ЖДАНЮК,
дэпутат Мінгарсавета.

Ганарар прашу пералічыць на рахунак № 700906 у камерцыйным банку «Дукат» на правядзенне рэферэндуму. МФО 153001.

БОЖА, РАТУЙ БЕЛАРУСЬ!

Нават пры пахаванні блізкіх у гаспадарцы дояць кароў. Так патрабуе народны звычай. А мы ці ж не заклікаем кінуць даіць апошніх жывых кароў, каб ператварыць беларускіх гаспадароў у нябожчыкаў? Упэўнены, такі будзе рэальны вынік увасаблення «наймадэрновейшага» палітычнага патрыятычнага «лёзунга» — разагнаць Вярхоўны Савет.

Галоўны аргумент для разгону: «Беларусь ідзе ў хвасце за Ельцыным. Так Беларусь застанецца на правах аўтаноміі новай Расейскай імперыі». І тут патрэбны ўдакладненні — хто з кім (ці за кім) і куды ідзе.

Сапраўды, Шушкевіч не ідзе на канфрантацыю з Ельцыным, бо асцерагаецца імперскіх выпадаў з боку маскоўскай крымінальнай буржуазіі, чыім сцягам з'яўляецца Ельцын.

Але Пазняк, які ў многім справядліва наракае на «расійскую імперыю Ельцына», па сутнасці патрабуе... паўтарыць маскоўскі анархічны сцэнарый!

Кебіч жа рэальна вывеў Беларусь з-пад залежнасці ад расійскай сыравіны, наладзіўшы дружалюбныя адносіны з Кітаем. І яго — дзе ж логіка?— абвінавачваць у «рабскім мысленні», у нізкапаклонстве перад Расіяй.

Хто ўбярог Беларусь ад крывавых сутыкненняў, ад танкаў і стралянінны на плошчы? Кебіч і Дземянцей. А Пазняк, як ні круці, клікаў на забароненыя мітынгі...

Хто ўбярог Беларусь ад голаду? Урад. Бо ў яго руках выканаўчая ўлада, і ён ціснуў на кадры, каб займаліся гаспадаркай, транспартам, каналізацыяй, а не мітынгамі.

Можа, пагрозы голаду не было ці няма? Беларусі не хапае збожжа, але хлеб ёсць. Расія мае хлебныя прасторы, а людзі галадаюць!

Хто «вінаваты», што ў нас няма нафты і вугалю, а ў хатах цёпла? Урад. У Ельцына ж нафта і шахты, газ і гідрастанцыі, а мерзнуць цэлыя гарады!

Кебіч — гэта пераемнасць улады і стабільнасць. Хто здольны яго замяніць? Ці ўпэўнены мы, што нехта лепшы? А калі будзе горш? Дык навошта рызыкаваць? Палітык не можа не рабіць падобную раскладку.

А рызыка жахлівая. Страціўшы стабільны ўрад, Беларусь увойдзе ў мітынговую анархію, вельмі блізкую да грамадзянскай вайны... Божа, ратуй «Беларусь ад маскоўскіх «дэмакрадаў» і каўказскіх прэзідэнтаў! І ад беларускіх балбатуноў, якія недалёка стаяць ад «ворагаў Беларушчыны».

Сярод іх Пазняк выглядае сёння трагічнай фігурай. Зянон па-рабеспіераўску ацэньвае беларускае Адраджэнне. А трэба ведаць, што не толькі Непадкупныя і Непахісныя вакол. Несумленныя і зладзеі, гультаі і няўклюды — таксама ж беларусы! І партакрат, і дурань, і Якуб Колас, і Дземянцей — таксама беларусы. І для Адраджэння больш зрабіў не шчыры беларус Навумчык, і нават не Вячорка, а супрацоўнік ЦК КПБ Іван Мележ і сакратар гаркома камсамола Андрэй Макаёнак.

Хлопцы, дэмагогія і шчыры плач — не духоўная культура беларуса. Узняўшы народ на барацьбу з русіфікацыяй, мы піхнулі нацыю ў кайданы амерыканізацыі. А гэта яшчэ больш жудасна, бо руская культура — Пушкін і Гогаль, а амерыканская—духоўная спадчына катаржнікаў, еўрапейскіх люмпенаў.

Сёння для беларусізацыі найбольшая небяспека — дэмагогі, якія хочуць у мітынговай анархіі перахапіць лейцы і пугу. Ці ўпэўнены мы, што прыйдуць гаспадары і сумленныя? На мітынгу і ў бойцы іх хіба выбіраюць? Некалі кадры адбіралі з дапамогай службы бяспекі такія безумоўна сумленныя людзі, як Сяргей Прытыцкі, як Пётр Машэраў—і то пралазілі жулікі і бандыты. Дык хто ж наловіць рыбкі ў мутнай вадзе, хлопцы? І што нам важней — пуга і крэсла ці Адраджэнне?

Захаваць дзяржаву, дзяржаўныя структуры, рэшткі законнасці — значыць выжыць! Будуць дзяржава, стабільны ўрад — будзе месца і для творчасці, і для балбатні. Сапхнуць урад Кебіча — будзе крывавая лазня і новы парадак. Якім ён будзе?

У Беларусі занадта трывожна, каб адмоўчвацца. Журналісты бегаюць за сенсацыямі і ніяк не падступаюцца да асэсавання гістарычных фактаў. Крымінальная хроніка адцягнула нас ад новых рэалій эпохі. А да канца веку ўсяго адна пяцігодка, калі карыстацца сталінскім хранометрам. І ўсё часцей і часцей хочацца замяніць лозунг «Жыве Беларусь» на словы роспачы і надзеі — Божа, ратуй Беларусь!

Уладзімір ІСКРЫК.

І КАЖУХІ, І БОТЫ

ТАЛАЧЫН (Т. Махтадуй). У снежні мінулага года ў калгасе імя Мічурына зарэгістравана арэндная прадпрыемства па выробліванню аўчын, а таксама шкур коней, цялят, коз, трусоў. Толькі за студзень тут выраблена прадукцыі на суму 40 тысяч рублёў. Амаль палавіна гэтай сумы ў выглядзе чыстага прыбытку паступіла ў калгасную касу.

Кіраўнік арэнднага прадпрыемства Раман Хранкоў мяркуе да канца года давесці выпуск прадукцыі да мільёна рублёў і 350 тысяч з іх перавесці на рахунак гаспадаркі.

Хутчэй за ўсё прыбытак будзе значна большым, бо адначасова з выробліваннем шкур распачнецца пашыў адзення і хромавых ботаў. У цэху прадпрыемства ўстаноўлены 9 швейных імпартных машын, на якіх будуць працаваць сапраўдныя майстры. Але самае галоўнае, што няма і не будзе праблем з пастаўкай сыравіны. Яна паступае не толькі з мясцовых гаспадарак, але і з суседніх раёнаў.

ПРЭМІЯ ІМЯ ОТА ГАНА

Дзіцячы ўрач Вольга Алейнікава з Мінска стала лаўрэатам прэміі імя Ота Гана, што прысуджаецца раз у два гады горадам Франкфурт-на-Майне. Так высока адзначаны яе заслугі ў барацьбе супраць лейкеміі і іншых ракавых захворванняў у дзяцей, пацярпеўшых ад чарнобыльскай аварыі. Яна загадвае ў Мінскай гарадской клініцы аддзяленнем, дзе лечацца «дзеці Чарнобыля», стаўшыя галоўнымі ахвярамі катастрофы. На гэтай пасадзе, адзначаецца ў рашэнні гарадскіх улад, Вольга Алейнікава самаддана і эфектыўна працавала па выратаванню дзяцей.

Яна стане першым лаўрэатам гэтай прэстыжнай прэміі з былога СССР з часу яе заснавання ў 1969 годзе. О. Ган—вядомы германскі вучоны, радыёхімік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі за даследаванні ў ядзернай галіне.

Уручэнне прэміі адбудзецца ва ўрачыстай абстаноўцы 8 сакавіка, што будзе ўдвая прыемна цяперашняму лаўрэату-жанчыне. Яшчэ адна прыемная нечаканасць—у гэтым годзе яе размер будзе падвоены і складзе 50 тысяч марак, бо пазалетась яна наогул не прысуджалася.

ФЕРМЕРЫ

1. «НАС ЗНІШЧАЮЦЬ, ЯК ПУСТАЗЕЛЛЕ»

Нататкі з нагоды рэспубліканскага конкурсу фермераў, ініцыятарам якога стала акцыянернае таварыства «Белаграпрамбіржа»

Жорсткія словы, якія вынесены ў загаловак, на вялікі жаль, былі сказаны не ў роспачы і не ў эмацыянальным запале, а будзённа і разважліва. Так звычайна гавораць пры падвядзенні нейкіх вынікаў. Канстатацыя безвыходнага становішча здзіўляла тым больш, што выходзіла яна ад аднаго з піянераў фермерскага руху ў Беларусі — Аляксандра Георгіевіча Скакаліна. І здзіўляла і збівала з панталыку. Бо справы ў яго, як нам паведамілі, ідуць больш-менш добра, гаспадарка развіваецца, становіцца на ногі. І вось такая заява. Мы ёй не паверылі.

Вытрымаўшы невялікую паўзу, Скакалін працягваў развіваць думку:

— Есць у агранаміі спосаб барацьбы з пустазеллем — метадам задушэння. Гэта — неаднаразовая культывацыя, падрэзанне каранёў непажаданых на полі раслін. Вось і дзяржава, і ўрад ставяцца да нас, як да пустазелля. З аднаго боку, аб'яўляюць аб сваёй падтрымцы, распрацоўваюць пэўныя меры, а з другога — душаць нас сваімі законамі, нарматыўнымі актамі, старымі інструкцыямі. Рынак прыціснуў казачнымі цэнамі.

37-гадовы Скакалін па прафесіі шафёр, вадзіцель міжнароднага класа. Працаваў у «Саўаўтатрансе» — вельмі прэстыжнай у нашым разуменні арганізацыі. Але кінуў «хлебнае месца». Ён ведаў, што можна рызыкуе, аднак спадзяваўся на свае сілы: прадпрымальнасць, знаходлівасць, асабліва ж — на зацікаўленасць дзяржавы ў фарміраванні новага слоя ўласнікаў. Не атрымалася. Тры гады фермерства даюць усе падставы гэта сцвярджаць.

— Часам даходзіць нават да прамых пагроз. Аднойчы, калі мяне не было дома, завіталі трое. Незнаёмцы прадставіліся работнікамі міліцыі, запатрабавалі ад жонкі ўсе паперы на набыццё тэхнікі, іншай маёмасці. Жонка не разгубілася і сказала: «Пакажыце вашы пасведчанні». Дакументаў яны не паказалі, затое пасыпаліся абвінавачванні ў крадзяжы, несумленных даходах, пагрозы выжыць нас адсюль, разарыць, пусціць з кайстрай па свеце. Потым высветлілася, што гэта акцыя была арганізавана мясцовымі начальнікамі,— расказваў Скакалін.

Яшчэ горш складваюцца адносіны з банкам. У Скакаліна зараз 43 гектары зямлі, ёсць вялікія планы. Аднак узяць ільготны крэдыт на развіццё гаспадаркі — неадольная праблема. Па-першае, патрэбен гарант, а дзе знайсці яго ў невялічкім райцэнтры Смалявічы? Па-другое, банк зусім не спяшаецца з выдачай грошай, усяляк адмаўляецца гэта рабіць.

— Ну, куды гэта варта, што з 200 мільёнаў рублёў, якія былі летась выдзелены з бюджэту рэспублікі на крэдытаванне фермераў, выкарыстана ўсяго 15 мільёнаў. Чаму? А таму, што банкам нявыгадна даваць нам крэдыт пад 2 працэнты, ім лепш выдаць грошы калгасу, заводу, малому прадпрыемству пад 15—20 працэнтаў. Цяпер жа ўсе банкі займаюцца камерцыяй, а мы ім толькі перашкаджаем, — пацвярджаў Скакалін гэты вывад уласным вопытам.

— Узяў 40 тысяч крэдыту на тэхніку. Неўзабаве спатрэбіліся сродкі на жывёлу. Прыйшоў у Смалявіцкі банк, а там кажуць — няма грошай. Тэлефаную ў Мінск, у Аграбанк. Там адказваюць — грошы павінны абавязкова выдаць, калі няма— няхай закажуць. За гэты званок у Смалявічах на мяне вельмі пакрыўдзіліся. І такія перашкоды літаральна на кожным кроку. Так і імкнуцца вынішчаць нас, як тое пустазелле,— вярнуўся Скакалін да таго, з чаго пачаў сваю споведзь.

Яго калегі, якіх мы запрасілі расказаць аб сваіх праблемах, у знак згоды заківалі галовамі: «Так, так...»

Конкурс для фермераў Беларусі, акрамя шанцу для іх паказаць сваё майстэрства, расказаць пра здабыткі, заваяваць каштоўны прыз, даў рэдкую сёння магчымасць падзяліцца набалелым. Пра сам конкурс, яго мэты і арганізатараў — «Белаграпрамбіржу» мы больш падрабязна яшчэ раскажам, а зараз хочацца пазнаёміць вас з большым колам удзельнікаў спаборніцтваў. Што гэта за людзі, якіх нярэдка за рашучасць і смеласць параўноўваюць з камікадзе. Фермераў, між іншым, нягледзячы на ўсе заклікі, ільготы, у 10-мільённай Беларусі надзвычай мала.

...У аўдыторыю, дзе фермераў экзаменавалі па практычных пытаннях жывёлагадоўлі, мы ціхенька зайшлі ў той момант, калі свае веды і навыкі дэманстраваў Уладзімір Лужнёў. Спачатку нам здалося, што ён былы заатэхнік ці ветурач. Але чым больш мы слухалі яго ўпэўненыя і эмоцыйныя адказы (іх потым ацанілі максімальнай адзнакай у 20 балаў), тым вышэйшым станавіўся рэйтынг хлопца ў нашых вачах. Падумалася нават: у мінулым, пэўна, галоўны спецыяліст.

Аднак пры знаёмстве высветлілася, што 33-гадовы Лужнёў — карэнны мінчанін. Да арміі і пасля працаваў у асноўным з металаканструкцыямі і механізмамі, у дзяцінстве і юнацтве вельмі захапляўся авіямадэльным спортам. Майстар спорту, суддзя рэспубліканскай катэгорыі, тройчы чэмпіён Беларусі— такія яго спартыўныя вехі. І яшчэ вельмі любіў прыроду. Таму, калі бацька, Ілля Якаўлевіч, кадравы мантажнік, набыў у вёсцы Старына ў 1978 годзе стары дом «пад дачу», ён стаў яго надзейным памочнікам.

Тады пра фермераў яшчэ гаворкі не было, але пачалі ўжо зваць вясковых людзей у ранадатары. Бацька з сынам вырашылі паспрабаваць. Заключылі дагавор з «Мінскай агароднінай фабрыкай», ім выдзелілі зямлю, пяць кароў. Набылі трактар, нейкі інвентар. Уладзімір, каб не быць дылетантам у сельскай гаспадарцы, паступіў у Мар'інагорскі саўгас-тэхнікум.

Справа ў Лужнёвых ладзілася. Паступова выспела думка сур'ёзна заняцца фермерствам. Дырэктар фабрыкі пайшоў ім насустрач. Цяпер у іх 13 кароў, 3 кані, на 21 гектары зямлі вырошчваюць кармы. За апошнія два гады Лужнёвы прадалі дзяржаве 90 тон малака. Увесь прыбытак ідзе на закуп абсталявання.

Уладзімір, нягледзячы на ўсе цяжкасці станаўлення гаспадаркі, не губляе аптымізму. Як і веры ў правільнасць рашэння прысвяціць сябе працы на зямлі. Тлумачыць ён свой выбар не жаданнем «быць гаспадаром», «знайсці незалежнасць», «расчараваннем у калгасах», іншымі бясспрэчнымі, але ўжо набіўшымі аскому словамі, аргументамі.

— Я перакананы прыхільнік хутарской сістэмы ў сельскай гаспадарцы. Па-замежнаму — фермерства. Сутнасць, на мой погляд, адна і тая ж. Для мяне фермерства — гэта не сродак няблага зарабляць, а найперш — спосаб жыцця. Менавіта такія рысы фермерства, як свабода, незалежнасць ад чыноўнікаў, магчымасць займацца тым, што спадабаецца, і ўвогуле — жыць і працаваць усёй сям'ёй на прыродзе, уяўляюцца галоўнымі каштоўнасцямі.

У гэтых словах маладога Лужнёва, здаецца, уся філасофія фермерства, яго прывабнасць. Менавіта яна дае сілы насуперак усім цяжкасцям і перашкодам ісці да мэты.

Леанід ЛАХМАНЕНКА,
Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

На здымках: фермеры — людзі прадпрымальныя, кемлівыя, дасціпныя; **А. Скакалін:** «У нашай справе ўсё трэба ўзважыць»; **У. Лужнёў:** «Дальны апарат патрабуе догляду».

Нямала часу спатрэбіцца нам, каб зразумець прычыны няўдач усіх ранейшых рэформ, а таксама рэформ цяперашніх. Аднак адну з іх можна амаль беспамылкова назваць і сёння — гэта самавольства ва ўсіх яго праявах.

Тут не месца шукаць яго карані і аналізаваць генезіс з'явы. Прывядзём толькі заўвагу, якую зрабіў Леў Талстой у сваім дзённіку 9 сакавіка 1906 года: «Як яскрава адлюстравалася на рэвалюцыянерах, калі яны пачыналі захоплваць уладу, звычайнае разбэшчвальнае ўздзеянне ўлады: ганарлівасць, фанабэрыя і, галоўнае, непавага да чалавека».

Ліст, які мы прапануем вашай увазе, напісаны ў нашы дні. Але як падобны ён на тыя пісьмы, якія дзесяткамі тысяч пісаліся і да застою, і пры яго росквіце, і, між іншым, у гады так званай перабудовы. Змяшчаем яго з некаторымі скарачэннямі, без усякага «прычэсвання».

Адкрытае пісьмо

Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ШУШКЕВІЧУ С. С.

Паважаны Станіслаў Станіслававіч!

Звяртаюся да Вас асабіста, аднак думаю, што пад гэтым пісьмом паставіць свой подпіс кожны сумленны прадпрымальнік Беларусі.

Ва ўмовах абвешчанай свабоды прадпрымальніцтва ў ініцыятыўных людзей з'явілася жаданне ўдзельнічаць у перабудове, прыкласці свае сілы і веды, каб змяніць да лепшага стан эканомікі рэспублікі. Аднак нашы імкненні натыкнуліся на непрабівальную сцяну старой сістэмы.

Парламент рэспублікі, яе ўрад, разумеючы неабходнасць карэнных рэформ, зрабілі пэўныя крокі ў гэтым напрамку. Але старая сістэма, нагнятаючы атмасферу ўсеагульнага страху і нявер'я, актыўна супраціўляецца.

Самае трагічнае ў тым, што ініцыятыўныя людзі, і я ў тым ліку, паверыўшы ў незваротнасць гэтых працэсаў, уключыліся ў перабудову. На справе ж аказалася, што ўсе абвешчаныя ў новых законах гарантыі ў сапраўднасці — проста лозунгі.

У жніўні 1988 года я зарэгістраваў кааператыў «Метраном», які на працягу трох гадоў ператварыўся ў буйную недзяржаўную структуру з разнастайнымі філіяламі і аддзяленнямі на тэрыторыі рэспублікі і былога Саюза. Ён будаваў школы, магазіны, бальніцы, жыллё, выраблял адзенне, аказваў розныя паслугі насельніцтву. Агульны гадавы аб'ём работ і паслуг перавысіў узровень у 100 мільёнаў рублёў.

У перыяд, што папярэднічаў путчу 1991 года, мы пачалі адчуваць на сабе пастаянны ўціск з боку розных дзяржаўных органаў, якія зразумелі, што пры наяўнасці сістэм, падобных «Метраному», пры стварэнні кармальнага цывілізаванага рынку ім не застанецца месца. І «Метраному» аб'явілі вайну. Пачаліся абвальныя праверкі з боку былых народнага кантролю і органаў БКСУ, гандлёвай інспекцыі і КДБ, якія, як ні стараліся, не выявілі нічога процізаконнага, хоць у ініцыятараў гэтых праверак было вялікае жаданне прадставіць нас віноўнікамі эканамічных непаладкаў.

І тады з жаданнем «знайсці» хоць што-небудзь у справу ўключылася падатковая інспекцыя Савецкага раёна г. Мінска, вядомая сваёй беззаконнай барацьбой з кааператывам «ДІА». Пачалася татальная праверка дзейнасці «Метраномa» і ўсіх яго філіялаў. Канфіскоўвалася пры гэтым уся дакументацыя, у тым ліку і тая, што не належала яе кампетэнцыі, арыштоўваліся банкаўскія рахункі, што паралізавала работу «Метраномa». Усё, што ўдалося ім «выявіць», — гэта бухгалтарская памылка, узнікшая ў перыяд змянення заканадаўства аб аплаце падаткаў філіялямі, таму што да трэцяга квартала 1989 года аплата рабілася па месцы іх знаходжання праз дырэкцыю, размешчаную ў г. Мінску. Каб не змянілася заканадаўства, дырэкцыя працягвала б здаваць агульную дэкларацыю аб дзейнасці ўсяго «Метраномa» і памылка была б выпраўлена ў наступным квартале.

Дырэкцыя, якая займалася цэнтралізацыяй грашовых сродкаў філіялаў, каардынацыяй і фінансаваннем іх дзейнасці, развіццём знешнеэканамічных сувязей, пытаннямі цэнтралізаванага забеспячэння, а таму не мела даходаў, па рашэнню райфінаддзела штоквартальна, пачынаючы з трэцяга квартала 1989 года, прадстаўляла замест пустой, з прочыркамі, дэкларацыі даведку аб адсутнасці даходаў, якая адпавядала рэчаіснасці. Тым не менш, падатковая інспекцыя, якая выдзелілася з гэтага фіноргана райвыканкома, пачала сцвярджаць, што дырэкцыя «Метраномa» павінна была здаваць дэкларацыі, а не даведкі, а калі дэкларацыя не здавалася, дык, значыцца, усе паступіўшыя грашовыя сродкі з'яўляюцца даходам.

Грунтуючыся на гэтым, падатковая інспекцыя ўсе паступаўшыя на рахунак дырэкцыі за гэты перыяд грошы аб'яўляе «ўтоеным даходам», з якога, на яе думку, трэба было б заплаціць 546.000 рублёў падаткаў. Аналагічным чынам налічаюцца штрафныя санкцыі ў памеры 5,5 млн. рублёў. Сукупна «выкрадзеная» «Метраномам» у дзяржавы сума выглядае яшчэ больш салідна — 6,5 млн. рублёў! Зыходзячы з гэтага, падатковая інспекцыя санкцыянірує вяртанне ў даход дзяржавы наяўных грашовых сродкаў з рахунку дырэкцыі і нават іншых арганізацый. Беззаконнасць перамагае.

У выніку ўсіх гэтых неправамерных дзеянняў кааператыў быў вымушаны спыніць сваю дзейнасць і аб'явіў аб самаліквідацыі, таму што барацьба была б проста бяссэнсавай, а судовая перспектыва — зацяжная, на некалькі гадоў.

Ліквідаваўшы кааператыў, сабраўшы новых заснавальнікаў, я і мае калегі стварылі асацыяцыю з той жа назвай. Да гэтага часу ў краіне быў ліквідаваны путч, і ў нас адрадзілася надзея на тое, што абвешчанае законам прадпрымальніцтва будзе спакойна развівацца. Але не... Пачаўся новы віток барацьбы з усім новым у эканоміцы, з людзьмі якія працуюць па правілах рынку, у тым ліку і са мной.

Цяпер ужо асабіста супраць мяне ўзбуджана крымінальная справа. Праз чатыры месяцы з моманту ліквідацыі кааператыва я абвінавачваюся па артыкулу 91 часткі 1 Крымінальнага кодэкса БССР, гэта значыць, у крадзяжы грашовых сродкаў на суму, што не перавышае 2.500 рублёў, пра якую мне нічога невядома. Апраўдацца я не магу, бо ўсе канфіскаваныя дакументы ліквідаванага ў жніўні 1991 года кааператыва ўжо амаль год знаходзяцца ў КДБ. Ва ўмовах існуючай беззаконнасці там могуць сфальсіфікаваць любы крадзеж, знішчыўшы хоць бы адзін грашовы дакумент. Цяпер ужо, таксама незаконна, выкарыстоўваючы факт узбуджанай супраць мяне крымінальнай справы, канфіскуюць дакументы асацыяцыі і яе заснавальнікаў, што з'яўляюцца самастойнымі юрыдычнымі асобамі, апячатваюць маёмасць, запалохваюць работнікаў арганізацый.

Дазвольце спытаць Вас, дакуль будзе працягвацца гэта беззаконнасць? Дакуль людзі, што стаяць за гэтай беззаконнасцю, будуць адчуваць сваю беспакаранасць?

Любы прадпрымальнік сёння затрачвае 90 працэнтаў свайго часу не на бізнес і справу, а адбіваючыся і адстайваючы сваю праўду. Але пакажыце хоць аднаго чыноўніка, які хоць чым-небудзь паплаціўся б ці адказаў за гэта самавольства! Пасля аб'ектыўных і неаб'ектыўных публікацый у газетах я атрымаў мноства водгукаў, у якіх людзі выказваюць сумненне ў тым, што ў нашай рэспубліцы наогул магчымы нейкія рыначныя адносіны і будуць нарэшце прыняты законы, якія забяспечвалі б на справе нашы правы.

Я спадзяюся, што гэты зварот будзе пачуты ўсімі разумнымі людзьмі, якія ў сілах змяніць існуючае ў рэспубліцы становішча. Заклікаю Вас — паспяшайцеся. Ва ўсіх цывілізаваных краінах існуюць урадавыя праграмы дапамогі прадпрымальнікам і прыцягнення людзей у прадпрымальніцтва. Мы не просім дапамогі. Абараніце нас хоць бы ад самавольства тых, хто перашкаджае нам накарміць і апрануць людзей. Мы хочам убачыць нашу рэспубліку квітнеючай і багатай. Толькі дайце спакойна працаваць.

С. БРУКЕР,
прэзідэнт асацыяцыі «Метраномa», член савета Саюза прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь.

Каментарый па сутнасці пытання

Прэзідэнт Саюза прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь У. КАРАГІН:

Гэту сумную гісторыю я ведаю добра: у пісьме ўсё выкладзена правільна. Што перш за ўсё ўражвае ў гэтай эпапеі? Поўная безабароннасць прадпрымальніка, калі практычна ні адна кампетэнтная інстанцыя не пажадала ўнікнуць у сутнасць справы, разабрацца па закону і па справядлівасці. А як жа тады славуты прынцып прэзумпцыі невінаватасці?

Пакуль што С. Брукер працуе ў Польшчы, а чаму ён не можа прыехаць у Беларусь — кожнаму разумнаму чалавеку ясна. Апошні раз я бачыў яго тут у ліпені мінулага года, калі ён прыйшоў у Саюз прадпрымальнікаў, каб параіцца. Ён скардзіўся, што яго пастаянна выклікаюць на допыты, пытанні ж задаюць вельмі прымітыўныя. Усё сведчыць пра тое, што справа надуманая, што праваахоўныя органы, якія яе распачалі, бездапаможныя ў сваіх намерах выставіць прадпрымальніка гэткім крымінальным элементам. Глядзіце— не знайшлі нічога лепшага, як прад'явіць смехатворную «прэтэнзію» ў размеры 2,5 тысячы рублёў.

А наогул, ці маглі б выбраць С. Брукера ў савет Саюза прадпрымальнікаў, каб ён не карыстаўся павагай і даверам, ці меў адпаведных чалавечых якасцей? Ведаю, хто-небудзь можа абвінаваціць мяне ў карпаратыўнай, так сказаць, прыхільнасці, але скажу шчыра: у справах бізнесу ён — чалавек педантычны і патрабавальны, працуе сумесна з юрыстам, адным словам, закон паважае.

Заўважу, што, напрыклад, у Злучаных Штатах да цывілізаванага ўзроўню прадпрымальніцтва ішлі прыкладна 120 гадоў. Нашы дамарослыя бізнесмены, думаю, гэты шлях пройдуць значна хутчэй. А вось іх ганіцелі, якія ніяк не могуць адмовіцца ад застарэлых ідэалагічных догмаў, нармальных рыначных адносін не ўспрымуць, відаць, і за сто гадоў. Ва ўсякім разе, Саюз прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь абавязкова будзе С. Брукера абараняць — усім сваім аўтарытэтам і магчымасцямі. І, думаю, мы здолеем гэта зрабіць.

Сакратар Пастаяннай камісіі па пытаннях працы, цэн, занятасці і сацыяльнай абароненасці насельніцтва Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Б. ГЮНТЭР:

Аўтара адкрытага ліста я асабіста не ведаю, таму буду гаварыць некалькі абстрактна. Сітуацыя, у якой ён апынуўся, тыповая не толькі для Беларусі, але і для іншых былых рэспублік былога Саюза. Амаль такі ж выпадак адбыўся, напрыклад, у Гомелі, толькі там справа да суда пакуль што не дайшла.

Вытокі эканамічнага самавольства, на маю думку, пачынаюцца ў верхніх эшалонах улады, а на ўзроўні ніжэйшых структур гэты працэс вызначецца разнастайнасцю нюансаў. Чаго яшчэ можна чакаць, калі адміністрацыйна-камандзірская рацэ практычна ўсюды засталася ля рычагоў улады і, карыстаючыся імі, нахабна займаецца «прыхватызацыяй» дзяржаўнай маёмасці, адначасова душыць рыначных канкурэнтаў.

На ўсё гэта наслойваецца прававое, юрыдычнае самавольства. Цывілізаванага ж заканадаўства адносна падатковай інспекцыі ў нас няма, і яна дзейнічае па інструкцыях застойных часоў. Калі такое заканадаўства з'явіцца— сказаць не магу, бо лобі старых структур у Вярхоўным Савеце блакіруе прыняцце любога закона, накіраванага на развіццё рыначных адносін. Сёння выгадна выкарыстоўваць падатковую інспекцыю ў якасці своеасаблівага тарана супраць непажаданых прадпрымальнікаў, вось яна і выконвае ідэалагічны заказ. Відавочна, што ўся гэта валтузня, распачатая вакол «Метраномa» і яго кіраўніка, мае яўную палітычную афарбоўку.

Галоўны спецыяліст упраўлення эканомікі Кіраўніцтва справамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Б. КОНАНАЎ:

Калі ўсё выкладзенае ў пісьме праўда— а сённяшняя практыка паказвае, што такая сітуацыя зусім магчымая, — то вывад напрошваецца адназначны: мы маем справу з рэцыдывамі таталітарнага мыслення.

Па службе я займаюся пытаннямі развіцця і падтрымкі прадпрымальніцтва. У апошнія месяцы заўважыў своеасаблівы парадокс: у многіх мясцовых Саветах пачалі разумець неабходнасць дапамогі нашаму маладому бізнесу, а вось кіраўніцтва гэтых структур па-ранейшаму застаецца ў палоне старых догмаў.

Сёння незадаволенасць насельніцтва пераносіцца на тых, хто займаецца пасрэдніцкай дзейнасцю. Заўважу, аднак, што ў бізнесе гэтыя людзі ў большасці — каліфы на гадзіну. Тыя ж прадпрымальнікі, якія хочуць займацца стабільнай вытворчасцю і знайшлі тут сваё прызванне, з-за штучных перашкод пакідаюць гэту дзейнасць, ідуць у тое ж пасрэдніцтва, а грамадства страчвае таленавітых людзей.

Урад рэспублікі разам з прадпрымальніцкімі структурамі пачаў распрацоўку праграмы па развіццю і падтрымцы беларускага бізнесу. Думаецца, нашаму парламенту трэба неадкладна аформіць увесь гэты працэс заканадаўча, у тым ліку і дзейнасць такога важнага органа, як падатковая інспекцыя. З-за шматлікіх канфліктаў многія бачаць у ёй асобе, вобразна кажучы, «карны меч рыначнай рэвалюцыі». Неабходна, каб яна была абсалютна незалежнай арганізацыяй са сваім бюджэтам і дзейнічала строга адпаведна закону. Калі ж закон парушаецца, трэба адказваць сваёй кішэняй — гэта, як вядома, адно з галоўных правіл рынку.

Старшыня Рэспубліканскага савета прафсаюза «Садружнасць» А. БОРТНІКАЎ:

У свой час я працаваў у Саўміне рэспублікі і ўвесь 1989 год курыраваў дзейнасць недзяржаўных эканамічных структур. Неаднаразова сустракаўся з аўтарам пісьма С. Брукерам і па рабочых пытаннях, і на грамадскіх мерапрыемствах прадпрымальнікаў. Скажу коратка: па ўзроўню мыслення, дзелавых якасцях гэта сапраўды сучасны прадпрымальнік, які сваёй дзейнасцю можа прынесці народнай гаспадарцы нямала карысці. Калі, зразумела, яго (як і іншых бізнесменаў) не будуць абкладваць «чырвонымі флажкамі». Што зробіш, калі ў дзейнасці некаторых падраздзяленняў падатковай інспекцыі пераважае яшчэ вядомы бальшавіцкі падыход — адабраць і раздзяліць.

Для дзяржавы страта такой арганізацыі, як «Метраном», з яго гадавым абарачэннем у 100 мільёнаў рублёў, ды яшчэ ва ўмовах нашага аголенага рынку — урон вельмі адчувальны. У распачатай супраць яго «акцыі» прагледжваецца чыйсьці кан'юнктурны інтарэс, які супярэчыць інтарэсам грамадства.

Дам кароткую даведку: прафсаюз «Садружнасць» аб'ядноўвае каля 100 тысяч работнікаў кааператываў, малых, арэндных, прыватных прадпрыемстваў. Дык вось, закрыццё «Метраномa» і яго філіялаў кіне ў абдымкі беспрацоўя тысячы людзей. Няма патрэбы гаварыць, што прафсаюзы супраць падобных антырыначных «свавольстваў».

Начальнік дзяржаўнай падатковай інспекцыі па Савецкаму раёну г. Мінска Міністэрства фінансаў РБ А. ДАРАШЭНКА:

Праверкай шматпрофільнага вытворча-гандлёва - закупачнага кааператыва «Метраном», які ў далейшым быў перайменаваны ў шматгаліновы навукова-вытворчы комплекс «Метраном», і яго філіялаў па пытанню ўзаемаадносін з бюджэтам, праведзенай работнікамі дзяржаўнай падатковай інспекцыі МФ РБ па Савецкаму раёну г. Мінска ў сакавіку — ліпені 1991 года, было ўстаноўлена, што за перыяд з 9.08.88 г. па 1.04.91 г. у выніку няпоўнага адлюстравання ў дэкларацыях аб даходах выручкі, паступіўшай ад рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг), адсутнасці ўліку фінансавых вынікаў за 1989 г., 1990 г. і 1 квартал 1991 года кааператывам былі дапушчаны ўтойванне падаткаабкладаемага даходу на суму 2.701.242 руб., нявыплата падатку з даходу 546.038 руб., запазычанасць па ўтрыманай з працуючых сумы падаткаў з заработнай платы ў 9.036 руб.

У адпаведнасці з Законам СССР «Аб падатках з прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый» і Законам СССР «Аб правах, абавязках і адказнасці дзяржаўных падатковых інспекцый» кааператыву ШНВК «Метраном» было прапанавана ўнесці ў бюджэт 6.343.845 руб. 40 кап. падатковых плацяжоў і фінансавых санкцый.

Дзяржаўная падатковая інспекцыя прадставіла матэрыялы ў пракуратуру для спагнання запазычанасці з маёмасці кааператыва, якая знаходзіцца ў трэціх асоб, у тым ліку 2,5 млн. руб. — у долевым укладзе ва ўстаноўчы фонд Мінскага камерцыйнага банка «Мікабанк».

Цяпер гаспадарчым судом Мінскай вобласці ўзбуджана справа і прынята да разгляду іскавая заява пракурора Савецкага раёна г. Мінска ў інтарэсах дзяржаўнай падатковай інспекцыі МФ РБ па Савецкаму раёну г. Мінска да асацыяцыі ШНВК «Метраном» аб прызнанні здзелкі па перадачы маёмасці кааператыва ШНВК «Метраном» асацыяцыі ШНВК «Метраном» у адпаведнасці з дагаворам № 64/3 ад 14.06.91 г. незаконнай і аб выкананні спагнання па даўгах перад дзяржавай кааператыва ШНВК «Метраном» у суме 3,3 млн. руб. на маёмасць і маёмасныя правы кааператыва, перададзеныя ва ўласнасць асацыяцыі ШНВК «Метраном».

Акрамя таго, па выніках разгляду матэрыялаў праверкі кааператыва ШНВК «Метраном» пракуратурай Савецкага раёна г. Мінска ў адносінах да генеральнага дырэктара кааператыва Брукера С. Л. 02.12.91 г. узбуджана крымінальная справа па ч. 1 арт. 91 КК РБ і накіравана ў РАУС для арганізацыі расследавання.

РЫНАК І АНТЫРЫНАК

ЗАНАДТА ДЗЕЛАВЫ... ЗА КРАТЫ?

У ЯКАСЦІ ПАСТСКРЫПТУМА: Пытанне, узнятае ў адкрытым пісьме, — зусім не асабістае. Яно закранае, напэўна, самую важную на сённяшні дзень праблему — ці здолеем мы стварыць нармальны цывілізаваны рынак, каб адносіны паміж яго ўдзельнікамі грунтаваліся толькі на законе. Пакуль жа ідзе барацьба: адны адстайваюць прыцыповыя палажэнні, іншыя — абараняюць гонар ведамаснага мундзіра. У выкладзеным канфлікце таксама проціборства меркаванняў, хоць відавочна, што пераважная большасць аўтараў каментарыяў падтрымліваюць пазіцыю прадпрымальніка.

Падзеі, якія разгарнуліся вакол асацыяцыі «Метраном» і яе кіраўніка, яшчэ далёкія ад завяршэння, ва ўсёй гэтай справе шмат, скажам так, няяснасцей. Не сказалі свайго апошняга слова і судовыя інстанцыі.

Таму рэдакцыя пакуль што не лічыць магчымым ставіць усе кропкі над «і». У свой час газета пазнаёміць чытачоў з вынікамі свайго ўласнага расследавання.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ,
аглядальнік «Звязды».

НА ПРАВАХ МАЛОДШАЙ СЯСТРЫ?

Яшчэ ў мінулым годзе з-за дэфіцыту паперы многія раённыя газеты Брэстчыны перайшлі з трохразовага выхаду ў тыдзень на двухразовы.

А вось чарговае новаўвядзенне, якое прапануе Брэсцкае ўпраўленне па друку, ставіць раённыя рэдакцыі на мяжу поўнага закрыцця. Прапанова такая: перайсці на аднаразовы выхад. Прычына тлумачыцца ўсё тым жа недахватам паперы.

Аднак, як удалося высветліць, паперы, выдзеленай Міністэрствам інфармацыі рэспублікі Брэсцкаму ўпраўленню па друку (а яно ў гэтым выпадку выступае ў якасці размеркавальніка) павінна хапіць усім.

Але чамусьці на рэдактараў раённак сёння адбываецца па сутнасці масіраваны націск, каб яны згадзіліся з аднаразовым выпускам сваіх газет. На жаль, не зусім прыгожую ролю адыгрывае ў гэтым і Брэсцкае ўпраўленне па друку. Яго начальнік Г. Тамашэвіч папярэдзіў рэдактараў, што разашле лісты заснавальнікам раённых газет, у якіх будзе сказана: паперы «раённкам» хопіць толькі на адзін выхад у тыдзень. З чым рашуча не згадзіліся іх рэдактары, бо навіны тыднёвай даўнасці абсалютна нікому не патрэбны.

А вось што сказала карэспандэнту БелаПАН супрацоўнік Міністэрства інфармацыі Т. Белаверава:

— Ні аб якім аднаразовым выхадзе «раённак» нават размова не павінна ісці. Паперы выдзелена дастаткова, каб захаваць іхні выпуск у ранейшым рэжыме, і Брэсцкае ўпраўленне па друку папярэджана, што ўсе павінны быць у роўных умовах — як «раённкі», так і абласная газета.

Выходзіць, нешта «круціць» шаноўны спадар Г. С. Тамашэвіч, заводзячы ў чарговы раз раённым газетам ролю «малодшых сястрычак-папялушак»?

Лявон МУХАВЕЦКІ,
БелаПАН.

А КАФЕДРА— У КАЛГАСЕ

ПІНСК (С. Шапіра). Новую пасаду атрымаў днямі старшыня вядомага калгаса «Парахонскі» Павел Пракопчык. Ён зацверджаны кіраўніком філіяла кафедры вытворчага навучання Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі.

Не выпадкова ў гэтай навучальнай установе выбралі «Парахонскі» ў якасці месца праходжання практыкі студэнтамі. Тут ёсць добрая тэхнічная база, буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, звыш дзесяці тысяч гектараў асушаных зямель, на якіх актыўна ўкараняюцца перадавыя тэхналогіі.

І, вядома ж, усе ўмовы для адпачынку.

ВОЗГАЛАС

ХАЙ ДАПАМОГУЦЬ МЕДЫКІ

З пачатку года значна актывізавалася пастаўка гуманітарнай дапамогі з Германіі на Піншчыну. У асноўным яна прызначана для дзяцей. У пасылках—прадукты харчавання, адзенне, медыкаменты. Зразумела, дарэнаму каню ў зубы не глядзяць. Аднак раённыя ўлады пастараліся ў карэктнай форме намякнуць, што беларусы здольныя самі пракарміць сябе і сваіх дзяцей. Сёння нам патрэбна дапамога ў арганізацыі лячэння хворых дзяцей. Прыемна, што немцы прынялі такую прапанову. Грамадскія арганізацыі зямлі Гесен згадзіліся правесці аздараўленне ў Германіі 80 дзяцей з павялічанымі нормамі накаплення радыенуклідаў у арганізме. У маі пройдуць месячны курс лячэння 30, у верасні—50 дзяцей з пінскіх вёсак, закранутых чарнобыльскай радыяцыяй.

ЦЭНЫ НА РЫНКАХ

(у рублях)

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ (Кузнечны рынак). Ялавічына—110—180, свініна — 80—200, куры — 150—250, масла — 250, алей — 100, тварог — 50, смятана — 100, яйкі — 40, бульба — 10—20, капуста — 30, буракі — 15—20, морква — 15—20, цыбуля—20—35.

МАСКВА (Рыжскі рынак). Ялавічына — 150—200, свініна — 150—200, куры — 100, масла — 150, алей —60, малако — 70, тварог — 70—90, смятана — 100, яйкі — 30, бульба — 15, капуста — 15, буракі — 15, морква — 15—20, цыбуля — 40—50.

МІНСК (Камароўскі рынак). Ялавічына —90—110, свініна — 90—120, масла — 100, алей — 76, тварог —40 — 50, смятана — 40—50, яйкі — 15, бульба — 6—8, морква — 10, цыбуля —10, яблыкі — 35 — 50, мандарыны 45—55, мёд — 200—250. Адзін купон — 20 капеек.

БРЭСТ. Ялавічына — 110—130, свініна — 100—130, яйкі — 10, бульба — 5, капуста — 5, цыбуля — 10, часнок (1 галоўка) — 5, яблыкі — 35—40, мандарыны —45—55, агуркі свежыя — 90, памідоры свежыя — 85—130. Адзін купон — 30 капеек.

ГОМЕЛЬ. Свініна — 80—90, бульба — 5, цыбуля — 15, часнок (1 галоўка) — 8, капуста — 5—7, яблыкі —40—55, лімоны — 100, мандарыны — 45—50, агуркі свежыя — 40—50, мёд — 140.

«Агенцтва РІД».

СТОЙ! АМАН ІДЗЕ!

Роўна праз 20 мінут пасля сігнала 40-гадовай мінчанкі К. злачынцы былі затрыманы нарадам АМАНа. Імі аказаліся.. два салдаты тэрміновай службы адной з вайсковых часцей. Прывабіла гэтых гангстэраў сумка, у якой знаходзілася 3 кілаграмы мяса і жаночая кашуля. Не хочацца лішні раз кідаць камень у армейскі «агарод», але ўсё часцей і часцей сярод затрыманых за злачынствы сустракаюцца ваеннаслужачыя.

ПАВУЧАЦЦА ФЕРМЕРЫ Ў ФРГ

БРЭСТ. Вывучае нямецкую мову група маладых спецыялістаў-аграрнікаў раёна. Іх чакае камандзіроўка ў ФРГ для знаёмства з вопытам вядзення сялянскай гаспадаркі. Група будзе жыць і працаваць у Паўднёвай Германіі некалькі тыдняў.

Паездка наладжваецца па ініцыятыве маладых дэпутатаў Брэсцкага гарсавета і бургамістрыні невялікага горада Равенсбрук, з якім сябруе Брэст.

ЦІ НЕ ДЛЯ ДУЭЛІ?

БРЭСТ (Ю. Фёдарава). З музея Брэсцкай крэпасці ўкралі пісталет. Праўда, цяжка меркаваць, каму і для чаго спатрэбіўся такі рэліктавы ствол. Справа ў тым, што крэмніеваму пісталету 150 гадоў. У экспазіцыі захоўваецца і сучасная зброя. Відаць, музею абароны Брэсцкай крэпасці давядзецца ахоўваць яе больш надзейна.

ЗОНА АСАБЛІВАЙ УВАГІ

ЦІ БУДЗЕ СПЕЦДЫСПАНСЕР?

або Як Расія прысвоіла 28 мільёнаў долараў, прызначаных чарнобыльцам

15 кастрычніка мінулага года наша газета расказвала аб тым, якія страсці разгарэліся вакол будаўніцтва ў Гомелі спецдыспансера — гэтага унікальнага медыцынскага цэнтра, прадугледжанага чарнобыльскай праграмай. Тады выказвалася трывога з прычыны таго, што з-за развалу эканамічных сувязей краіны аб'ект можа аказацца пад пагрозай зрыву.

Нашы апасенні пацвердзіліся. Становішча спраў зараз на крытычнай адзнацы. Паспяховае будаўніцтва спецдыспансера знаходзіцца пад вялікім знакам пытання. Але аб усім па парадку.

Калі кіраўнікі вобласці падпісвалі кантракт з югаслаўска-швейцарскай фірмай «Смелт-Інтаг» на ўзвядзенне спецдыспансера, яны ведалі, што на рахунку аблвыканкома ёсць свабодна канверсуемая валюта за нафту, 300 тысяч тон якой Савет Міністраў СССР дазволіў прадаць за мяжу (гаворка ідзе аб нафце, якая здабываецца на Гомельшчыне). Тады паспелі атрымаць 28 мільёнаў долараў, якія паступілі на рахунак Знешэканомбанка СССР. У лістападзе мінулага года аблвыканком даў яму даручэнне пералічыць 12 мільёнаў долараў у якасці авансу фірме, бо да гэтага часу ад Баварскага аб'яднанага банка ў Германіі, які ўзяўся праводзіць усе фінансавыя аперацыі і гарантаваў, што грошы будуць выдаткоўвацца строга на прызначэнню, у аблвыканком паступілі неабходныя дакументы.

— Але ў снежні, — расказвае намеснік старшыні аблвыканкома Аляксандр Ярчак, — наша даручэнне не было выканана, бо ў тым банку ніякіх грошай не было і ён прыняў самавольнае рашэнне не пералічваць іх крэдыторам. А ў пачатку студзеня гэтага года Знешэканомбанк СССР наогул перастаў існаваць у сувязі з развалам Саюза. Замест яго ўтвараецца Знешэканомбанк Расіі. І нашы спробы атрымаць крэдыты ў Германіі праз яго (такія крэдыты нам былі прадастаўлены раней) пацярпелі крах.

Але як усё ж атрымаць выдзеленыя грошы? Паспрабавалі пералічыць іх у створаны Знешэканомбанк Рэспублікі Беларусь, але Масква катэгарычна адказала: не! Туды з Гомеля паляцелі пісьмы, тэлеграмы, выехаў у спецыяльную камандзіроўку старшыня аблвыканкома Мікалай Вайцянкоў. Усё дарэмна — ніхто і не збіраўся ў банку аяртаць Гомелю хоць бы долар. А валюта ж, паўтараем, прызначалася для гаротнікаў-чарнобыльцаў, якія, дарэчы, зарабілі яе самі.

Звярнуліся да ўрада Рэспублікі Беларусь. У Маскву на адрас Я. Гайдара паляцела пісьмо за подпісам М. Мясніковіча. У ім падкрэслівалася вострая неабходнасць мець у рэспубліцы спецдыспансер, указваўся спосаб атрымання валюты і рабіўся акцэнт на тое, што затрымка з пераводам грошай пацягне за сабой вялікія штрафы з боку іншаземнай фірмы, а гэта яшчэ больш ускладніць і без таго цяжкае фінансавае становішча рэспублікі.

Ягор Цімуравіч наклаў рэзалюцыю кіраўнікам Знешэканомбанка Расіі наступнага зместу: «Прашу ўрэгуляваць гэта пытанне разам з пытаннем удзелу рэспублікі ў выплаце працэнтаў па знешняй запазычанасці і ўдзелу ў аплаце фрахта» (за ўвоз збожжа з-за мяжы — **У. П.**). Такім чынам, атрымалася, што наша чарнобыльская гора змяшалі з усімі абавязацельствамі краіны—былога Саюза.

Атрымаўшы такі адказ, кіраўнікі вобласці і ўрада неаднаразова выходзілі на Я. Гайдара і ў рэшце рэшт пачулі такі адказ: за студзень Беларусь запазычыла ў іншаземных крэдыторaў 100 мільёнаў долараў, таму ніякіх грошай на ваш рахунак пераведзена не будзе. Пасля такога паведамлення М. Мясніковіч папрасіў Я. Гайдара вярнуць хоць бы частку — тры мільёны долараў на рахунак Гомельскага аблвыканкома. Адказу пакуль што няма.

Такая вось залежнасць ад Масквы. А ці ёсць усё ж надзея, што на спецдыспансер, дзе айчынныя будаўнікі асвоілі ўжо звыш сямі мільёнаў рублёў капітальных укладанняў, у хуткім часе прыйдуць будаўнікі замежныя? Мяркуйце самі. Каб удалося атрымаць тыя тры мільёны долараў да дзевяці мільёнаў, якія восьвось павінны паступіць за прададзеную нафту, гамяльчане маглі б перадаць 12 мільёнаў долараў авансу фірме, якая нягледзячы на ўсе нашы пературбацыі, поўным ходам вядзе праектаванне спецдыспансера. Яна гатова прысласць людзей і тэхніку, як толькі атрымае гэты аванс, аб чым кіраўнікі яе заявілі камандзіраваным у фірму дырэктару спецдыспансера Б. Самалічэнку і галоўнаму ўрачу В. Дзяржыцкаму.

А што далей? Гомельскі аблвыканком звярнуўся ў Савет Міністраў РБ з просьбай дазволіць на працягу чатырох гадоў прадаваць за мяжу па 150 тысяч тон нафты, валюта за якую і пойдзе на аплату фірме. Гэты дакумент ва ўрадзе ўжо завізіраваны. Будзем спадзявацца на лепшае.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

2 сакавіка ў Мінску ў выставачнай зале па праспекце Машэрава, 7 адкрылася выстаўка

«ЭКСПОЛЬ-92»,

на якой прадстаўлена прадукцыя польскіх і беларускіх фірмаў. Тут можна ўстанавіць дзелавыя кантакты, правесці перагаворы, заключыць кантракты.

Работа выстаўкі працягнецца па 5 сакавіка.

На здымках: павільёны, дзе прадстаўлены тавары народнага спажывання, прадукты харчавання і інш.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

СТОП-ФАКТ

ТЭАТР ПАЧЫНАЕЦЦА З... КАСЦЮМА

Нехта з класікаў у свой час кінуў знакамітую фразу: «Тэатр пачынаецца з вешалкі». Можа і так, але тым, хто прыйшоў паглядзець спектакль і размясціўся ў крэслах, неяк не варта думаць аб уладкаванні ўласнага гардэроба. Першае, што кідаецца тэатралам у вочы, — прыгажосць і арыгінальнасць сцэнічных дэкарацый, неардынарнасць касцюмаў і іх адпаведнасць дзеянню. Якасная работа тэатральнага мастака ўсё часцей становіцца не толькі адным з асноўных элементаў поспеху п'есы, але і важкім крытэрыем узроўню тэатральнага мастацтва наогул. А ён даволі высокі, аб чым сведчаць вынікі выставы беларускага тэатральнага мастацтва сезона 1990—1991 гадоў.

Нягледзячы на свабодны ўваход, патоку наведвальнікаў не наглядалася. Нават наадварот, тыя нешматлікія мінчане, якія рызыкнулі заглянуць у маленькую залу Палаца мастацтва, доўга ў ёй не затрымліваліся. Адзін з маладых жартаўнікоў, дарэчы, напісаў у кнізе водгукаў характэрную фразу: «У вашай выставачнай зале вельмі здорава цалавацца з любімай дзяўчынай. Я». Але справа не ў гэтым. Адсутнасць зацікаўленых гледачоў поўнасцю кампенсавалася шчодрымі ўсплёскамі таленту маладых тэатральных мастакоў Беларусі.

Парадаваў новымі работамі Дзмітрый Мохаў. Яго эскізы, дзкарацыі да оперы «Князь Навагрудскі» А. Бандарэнкі ў пастаноўцы ДАВТа Беларусі прадэманстравалі нестандартныя погляды мастака і добрае ведание ім тэмы. Яшчэ больш уразілі яго эскізы касцюмаў да спектакля «Рамэо і Джульета», пастаўленага Рускім ТЮГам Ташкента рэжысёрам Найдзёнавым. Вельмі няпроста было апрануць шэкспіраўскіх герояў, улічваючы катастрафічны недахват тканіны і матэрыялаў. Але Мохаў змог пераадолець усеагульны дэфіцыт і зрабіць уборы Джульеты ў стылі лепшых вячэрніх сукенак сучасных французскіх і італьянскіх мадэльераў.

Выстава дазволіла выявіць тэндэнцыю да не заўсёды апраўданых эксперыментаў у выкарыстанні колера. Лепш за ўсё гэта падкрэслівае яшчэ адзін запіс у кнізе водгукаў: «Ваша шчасце, што вы не ведаеце, што робіце з колерам. Колер патрабуе павагі да сябе. Гэта не толькі ваша бяда. Сінчук Н. С.». І сапраўды, многія з маладых мастакоў нават у класічных спектрах (напрыклад, па п'есах Астроўскага і Чэхава) яўна злоўжываюць рознакаляровасцю, без усялякіх аб'ектыўных падстаў, касцюмаў і дэкарацый. Хоць з іншага пункту гледжання адыход ад канонаў можна трактаваць і як творчую індывідуальнасць Вольгі Жалонкінай, Элеаноры Грыгарук, Людмілы Ганчаровай.

А наогул выстава беларускага тэатральнага мастацтва пакінула ўражанне, што ёсць і ў нашай рэспубліцы таленты, здольныя трымаць «гонар маркі». І хоць у гэтай «мажорнай» фразе пэўная доля авансу, будзем усё ж памятаць, што тэатр не заўсёды пачынаецца з вешалкі.

Станіслаў СУЛКОЎСКІ.

CREAZIONI IN PELLE

Са скур, імпартуемых з Італіі, фірма шые адзенне, выробляе галантарэйныя тавары.

Фірму «Пальсадора» цікавяць гандлёвыя сувязі з беларускімі прадпрыемствамі і прадпрымальнікамі.

Запрашаем на выстаўку тавараў фірмы — пр. Машэрава, 7.

Адрас фірмы ў Польшчы:
45—002, Opole,
ul. Poswiatowskiej, 4.
Tel. 352-71-72.
Fax 352-72.
Tlx 732474.

ПУНКТ ПОГЛЯДУ

Рэвалюцыі і архівы

Архівы — памяць народа. Няхай даруе мне чытач гэтую фразу, якая стала банальнай, але я павінен яе напомніць перш за ўсё тым, хто хацеў бы на многае забыцца, або, дакладней сказаць, не ўспамінаць самому і пазбавіць магчымасці іншых рабіць гэта.

Ці не адсюль заклікі да знішчэння захоўваемых у архівах дакументаў палітычных партый і грамадскіх рухаў новага часу пад «прыстойнай» прычынай іх «малакаштоўнасці», «непатрэбнасці» і інш.? Дарэчы, па гэтых прычынах, а таксама выкарыстоўваючы стагоддзямі накопленую злосць простых людзей да «караючых і наглядаючых» устаноў, у лютым-сакавіку 1917 года ў Расіі, Беларусі, на Украіне былі знішчаны архівы многіх ахранных аддзяленняў, жандарскіх упраўленняў, паліцыі і г. д. Прывяду толькі два сведчанні на гэты конт, узятыя з беларускіх газет таго часу. Так, «Мінскі голас» паведамляў 19 сакавіка 1917 года: «Магілёў. 17 сакавіка. Прэзідыум палітычнай падсекцыі гарадскога выканаўчага камітэта, запрасіўшы губернскага камісара і пракурора, зрабіў вобыск у жандарскім упраўленні. Пасля вобыску 5 афіцэраў упраўлення арыштаваны. Справы апячатаны. Частку сакрэтных папер жандары знішчылі».

«Новая Варшаўская раніца» 30 сакавіка 1917 года інфармавала сваіх чытачоў: «Да губернскага камісара паступіў рапарт начальніка гарадской міліцыі аб тым, што былым начальнікам мінскай ахранкі палкоўнікам Бабчынскім знішчаны ўсе справы ахранкі і спісы агентаў і правакатараў. Начальнік міліцыі хадайнічае пачаць па гэтай справе афіцыяльнае расследаванне».

Не праводзячы абсалютна ніякіх аналогій паміж падзеямі 75-гадовай даўнасці і днём сённяшнім, тым не менш хачу звярнуць увагу чытачоў на тое, што менавіта ў часы грамадскіх катаклізмаў найбольш безабаронымі, нароўні з людзьмі, аказваюцца архіўныя дакументы. У адрозненне ад тыражаваных кніг, брашур, часопісаў, газет, гібель якіх у адной бібліятэцы можа быць папоўнена за кошт захоўваемых у іншых, страты архіўных дакументаў незваротныя, бо яны, накіроўваючыся ў архівасховішча праз своеасаблівае «чысціліча», якое называецца экспертызай каштоўнасці, апынаюцца там, як правіла, у адзіным экземпляры. Сусветная гісторыя дае нам нямала сумных і павучальных урокаў, калі ў выніку неахайнасці, а таксама карыслівых намераў і амбіцый уладатрымальнікаў цывілізацыя пазбавілася многага з таго, што было накоплена чалавечым вопытам, зафіксавана ў дакументах і захавана ў архівах.

Сёння мы вельмі многае пераглядаем і пераацэньваем у той гістарычнай эпосе, якая пачала свой адлік з кастрычніка 1917 года. Шмат справядлівых крытычных заўваг ужо выказана ў адрас арганізацыі і функцыяніравання дзяржаўнай архіўнай службы былога Саюза ССР. У ліку іх — неабгрунтаванае засакрэчванне значных комплексаў дакументаў, існаванне цэлай сеткі ведамасных архіваў, доступ да дакументаў якіх для пераважнай большасці даследчыкаў быў немагчымы; асобна дзеючая сістэма партыйных (КПСС) архіваў, якая дапускала ў свае чытальныя залы даследчыкаў па крытэрыях, ёй жа самой (сістэмай) устаноўленых, і многае іншае. Усё гэта было. Не было толькі аднаго, чаго не пазбеглі многія сусветныя рэвалюцыі, а менавіта: масавага знішчэння архіўных дакументаў.

Апошняе дало падставу прыхаўшаму ў 20-я гады ў СССР для абследавання савецкіх архіваў дырэктару Нацыянальнага архіва Францыі акадэміку Ш. Ланглуа заявіць: «Ваша рэвалюцыя была разумнейшай за нашу», маючы на ўвазе знішчэнне ў часы Вялікай Французскай рэвалюцыі вялікіх духоўных багаццяў французскага народа. Урады савецкіх рэспублік і далей знайшлі ў сабе дастаткова мудрасці, каб прадухіліць гібель дакументаў старых архіваў, якая пагражала ва ўмовах папяровага голаду 20-х гадоў перарасці ў вакханалію знішчэння архіваў. Вядома, што дзякуючы намаганням навуковай грамадскасці Мінска, кіраўніцтва Наркамасветы Беларусі ў пачатку 1919 года быў выратаваны ад гібелі архіў былога Мінскага губернскага праўлення, які быў ужо вывезены ў Шклоў для перапрацоўкі на папяровай фабрыцы. Ён быў вернуты ў Мінск і размешчаны ў будынку манастыра Святога Духа, адкуль, праўда, у 1921 годзе адправіўся на Барысаўскую пісчапаперовую фабрыку.

Хоць вышэй я перасцерагаў чытачоў (і перш за ўсё сябе) ад аналогій, яны міжволі ўзнікаюць. Зноў загаварылі аб «папяровым голадзе», і ўжо адчуваецца яго праяўленне: не выходзяць многія газеты; няма паперы, каб надрукаваць падручнікі, школьныя сшыткі і інш. Ці не паспрабуюць і сёння, як 70 гадоў таму назад, нашы гаспадарнікі вырашыць праблему паперы за кошт «старых спраў»? Гэта было б трагедыяй для нашай культуры, нашага народа.

Станаўленне архіўнай службы Беларусі прайшло працяглы і часам трагічны шлях: ад архіваў Вялікага княства Літоўскага праз Віцебскі архіў старажытных актаў да той сеткі дзяржархіваў, якая функцыяніруе сёння. Апошняя, як вядома, уключае 6 цэнтральных, столькі ж абласных дзяржархіваў і 16 іх філіялаў.

Некалькі слоў аб умовах, у якіх працуюць цяпер архівы Рэспублікі Беларусь. Але спачатку зноў звернемся да гісторыі. Вядома, што для канцэнтрацыі і захавання актавых кніг 2 красавіка 1852 года быў выдадзены ўказ, у адпаведнасці з якім засноўваліся тры цэнтральныя архівы старажытных актаў — Кіеўскі (для Украіны), Віленскі (для Літвы) і Віцебскі (для Беларусі). Кіеўскі і Віленскі архівы пачалі функцыяніраваць з года іх заснавання, будучы размешчанымі: першы — у будынку Кіеўскага універсітэта, другі — у будынку былога Віленскага універсітэта. Віцебскі ж архіў з-за адсутнасці памяшкання пачаў сваю дзейнасць толькі праз адзінаццаць гадоў пасля яго заснавання, калі пад яго быў прыстасаваны мясцовы касцёл. Але ўжо ў 1902 годзе гэты архіў, які абслугоўваўся адным(?!) супрацоўнікам, быў зліты з Віленскім і праз год пераведзены ў Вільню.

І пасля 1917 года доляй не толькі мясцовых, але і цэнтральных архіваў Беларусі стала іх знаходжанне ў былых цэрквах, касцёлах, манастырах.

Важнейшы архіў Беларусі — гістарычны — размешчаны ў адным будынку з дзяржархівам Мінскай вобласці і лабараторыяй па рэстаўрацыі і мікрафішыраванню дакументаў (па вул. Казлова). Ён мае вялікія цяжкасці ў абслугоўванні даследчыкаў. Агульная чытальная зала не ў стане размясціць усіх жадаючых працаваць у архівах вучоных, журналістаў, пісьменнікаў. А між тым, да гэтага часу не вырашана пытанне з будынкам былога Цэнтральнага партыйнага архіва Кампартыі Беларусі, які валодае не толькі належнымі ўмовамі для захоўвання дакументаў, але і мае цудоўныя чытальныя залы, добрае абсталяванне па рэстаўрацыі і мікрафішыраванню дакументаў і г. д.

Адзін з чатырох, спецыяльна пабудаваных для ўтрымання архіва будынкаў становіча аб'ектам сваркі паміж блізкімі (але ўсё-такі далёка не роднаснымі!) сістэмамі: архівамі і дзяржбібліятэкай імя Леніна. Не ставячы пад сумненне вострую неабходнасць паляпшэння «жыллёвых умоў» галоўнай бібліятэкі рэспублікі, тым не менш нельга не бачыць, што размяшчэнне часткі кніжных фондаў на плошчах архіва не вырашае праблемы бібліятэкі ў цэлым. Адначасова, калі будзе рэалізаваны варыянт «сумеснага пражывання» бібліятэкі і архіва, апошні рызыкуе ператварыцца сапраўды ў склад старых і не зусім старых папер, якім, на жаль, і ўяўляюцца архівы некаторым людзям, далёкім ад гісторыі, архіўнай справы. Справа ў тым, што ў выпадку «ўшчыльнення» супрацоўнікі архіва вымушаны будуць, зняўшы са стэлажоў большую частку дакументаў, складзіраваць іх, пазбавіўшы такім чынам даследчыкаў магчымасці працаваць з імі і падвяргаючы дакументы рызыцы быць «з'едзенымі» непазбежным пылам.

Прайшло амаль паўгода з таго часу, як закрылася чытальная зала партархіва; яшчэ не зусім прыступілі да работы залы нядаўна пераехаўшых архіваў Кастрычніцкай рэвалюцыі, літаратуры і мастацтва. На няпэўны час можа спыніць работу гістарычны архіў. Узнікае пытанне: у імя чаго гэта робіцца? У імя забеспячэння захаванасці дакументаў, паляпшэння іх выкарыстання ў навуковых і практычных мэтах? Нібыта не (бо вядома, што для архіваў, як і для бібліятэк, дарэчы, пераезды раўназначныя пажару). Тады навошта? Для рэвалюцыі ў архіўнай справе? Дык, можа, хопіць з нас рэвалюцый, хопіць няўдалых эксперыментаў, пакінем у спакоі хоць бы архівы, з тым, каб нашы нашчадкі не паўтарылі нашых памылак.

М. ШУМЕЙКА,
намеснік дырэктара Беларускага навукова-даследчага цэнтра дакументазнаўства і рэтраінфармацыі, кандыдат гістарычных навук.

«ГАНДЛЮ І БЕЗ ТОРТАЎ НЯКЕПСКА»

Калі ў нас надараецца свята, мы абавязкова хочам аздобіць наш стол прыгожым і смачным тортам. Колькі расчаравання, калі няма магчымасці набыць яго ў магазіне ці кулінарыі, бо выпякаць гаспадыні ці часу не хапае, ці не заўсёды ёсць у доме ўсё неабходнае для прыгатавання гэтага ласунку. А вось у кандытарскім цэху Мінскага хлебазавода № 5, нягледзячы на складанасці з сыравінай, гатаваць торт, пірожныя і кексы магчымасць ёсць. Кожны дзень адсюль вязуць у 90 магазінаў горада 5—5,5 тоны смачнай прадукцыі. Як жа выходзяць тут са становішча ў наш час татальнага дэфіцыту?

— Выручае багаты асартымент, — гаворыць начальнік цэха Любоў Дарашчонак. — Калі не хапае кампанентаў для прыгатавання аднаго прадукту, выпякаем іншы. З-за недахвату какавы, напрыклад, замест торта «Казка» пачалі выпякаць «Вясёлку», дзе какаву замяняем джэмам, варэннем ці павідлам.

Пры ўсім жаданні мы не зможам зараз знайсці ў магазіне тортаў «Ленінградскі», «Мінчанка», «Папялушка». Затое з'явіліся торты «Птушаня», «Вішня». Бываюць у магазінах і добра разыходзяцца наборы пірожных «Мінскі дэсерт», хоць і каштуе гэта радасць 110 рублёў. Па-ранейшаму праз магазіны можна заказаць торт да любой урачыстасці, і кандытары хлебазавода выканаюць заказ найлепшым чынам.

Але калі ў кандытарскім цэху пятага хлебазавода, выкарыстоўваюць усе магчымасці, каб забяспечыць нас ласункамі, дык чаму вечарам ці ў нядзелю нярэдка цяжка знайсці ў магазінах торт?

— Я сама гэта заўважыла, — абураецца Любоў Мікалаеўна. — Спытала ў адным магазіне, чаму гандаль не заказвае нам больш тортаў — мы ж можам павялічыць іх пастаўку. У адказ пачула: гандлю і без торцікаў някепска.

— Цяжка ўсім, — зрабіла вывад Любоў Мікалаеўна,— але трэба, каб у чалавека калі-нікалі былі і святы. А без нашай прадукцыі як? Таму нават пры самым мізэрным запасе прадуктаў будзем выпякаць што-небудзь салодкае. Каб толькі гандаль ім не грэбаваў. Але, калі здарыцца ўсё ж, што не знойдзеце ў магазіне патрэбнага да святочнага стала, Любоў Мікалаеўна прапануе самы просты рэцэпт прыгатавання бісквіту, з якога можна зладзіць торт. Патрабуецца для гэтага няшмат: 5 яек, шклянка цукру і шклянка мукі. Яйкі і цукар узбіць, дабавіць муку і добра размяшаць. Вылечаныя каржы аздобіць на ўласны густ і фантазію. Будзе смачна. І не вельмі дорага.

Марыя ДАБЖЫНСКАЯ.

ДАЮЦЬ. БРАЦЬ?

Гомель, несумненна, вызначаецца сярод абласных цэнтраў Беларусі аб'ёмамі атрымліваемай міжнароднай гуманітарнай дапамогі, што абумоўлена асобым яго становішчам пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Як ставяцца да гуманітарнай дапамогі самі гараджане? Гомельскі сацыялагічны цэнтр «Аракул» шляхам тэлефоннага апытання вырашыў даведацца аб адказе на гэтае пытанне, што называецца, з першых вуснаў. Усяго апытана 586 рэспандэнтаў. Вось як размеркаваліся адказы:

Якое з прыведзеных меркаванняў аб гуманітарнай дапамозе Захаду вам бліжэй за ўсё?

— акт добрай волі — 36 працэнтаў

— хітрыкі заходніх палітыкаў — 9 працэнтаў

— падачка багатых краін — 42 працэнты

— жаданне засцерагчы ад Чарнобыля — 10 працэнтаў

У якой меры гуманітарная дапамога вырашае праблемы сацыяльнай абароны насельніцтва?

— ніяк не вырашае — 52 працэнты

— нязначна вырашыць — 39 працэнтаў

— істотна вырашыць — 9 працэнтаў.

У якой гуманітарнай дапамозе, на ваш погляд, мы перш за ўсё маем патрэбу?

— прадукты, тавары — 5 працэнтаў

— аздараўленне дзяцей — 44 працэнты

— тэхніка і тэхналогія — 23 працэнты

— медыкаменты — 28 працэнтаў.

Якім чынам вам прыходзілася сутыкацца з гуманітарнай дапамогай?

— атрымлівала сям'я — 18 працэнтаў

— атрымліваў працоўны калектыў — 6 працэнтаў

— атрымлівалі знаёмыя — 18 працэнтаў

— чуў аб гэтым — 39 працэнтаў

— ніяк не сутыкаўся — 19 працэнтаў.

Гавораць: «Што вінен, аддаць павінен». Як вы лічыце, ці павінны мы адплаціць дабром за дабро?

— так, абавязкова — 47 працэнтаў

— не, мы аб дапамозе не прасілі — 12 працэнтаў

— яшчэ невядома, хто каму вінен — 28 працэнтаў

— калі гэта — дапамога, то вяртаць неабавязкова — 13 працэнтаў.

ЗАПРАГАЮЦЬ ХЛОПЦЫ КОНЕЙ

КАМЯНЕЦ (**Ю. Фёдарава**). У конюха — зарплата больш за 2.000 рублёў у месяц. Праўда, гэтыя конюхі працуюць не ў зусім звычайнай стайні, а на камянецкім адкормачным пункце. Гэты пункт, купляючы ў рэспубліцы коней, рэалізуе іх за валюту ў Італію. 75 працэнтаў выручкі атрымліваюць пастаўшчыкі, а 25 — камянецкія прадпрымальнікі. Натуральна, што высокія заработкі і ў конюхаў, і ў іншых, працуючых тут.

КУПОНЫ ЦІ ПАПЕРКІ?

МАГІЛЕЎ (А. Санчук). Рэзкае зніжэнне «курсу» беларускага купона назіраецца апошнім часам. У мінулую нядзелю на рэчавым базары (таўкучцы) абласнога цэнтра купон прадавалі за 50 капеек.

Рынак імгненна адрэагаваў на сітуацыю. Маецца на ўвазе рынак не як эканамічная сістэма, а цэнтральны калгасны рынак горада на Дняпры. Апошнія два дні тут можна было набыць неабмежаваную колькасць купонаў па 10 капеек.

Зазначым, што ў пачатку студзеня, калі купоны толькі з'явіліся, іх лёгка збывалі па 2 рублі. На думку назіральнікаў, падзенне «курсу» купона за 2 месяцы ў 20 разоў сведчыць, што з задачай па абароне спажывецкага рынку Беларусі ад «іншаземцаў» яны не спраўляюцца.

КАМАНДЗІРОЎКА НА ПАЎНОЧНЫЯ МЫТНІ

БРЭСТ. У супрацоўнікаў мытні з'явіліся новыя абавязкі. Найбольш вопытныя з іх камандзіраваны на граніцы з прыбалтыйскімі краінамі. Яны аказваюць дапамогу новым мытным службам і пастам Рэспублікі Беларусь. Ідзе практычная работа па забеспячэнню эканамічных інтарэсаў Беларусі.

Дзень дзелавога чалавека

Парады дае кандыдат медыцынскіх навук, спецыяліст па нялекавых метадах тэрапіі, аўтар 90 навуковых і 35 папулярных публікацый Павел САКАЛОЎ.

Сёння дзень дзелавога чалавека нагадвае спартыўнае спаборніцтва. Яно пастаянна патрабуе ад нас гранічных намаганняў, поўнай аддачы, работы на мяжы і нават па-за мяжою чалавечых магчымасцей. Такое пастаяннае напружанне вытрымліваць значна цяжэй. Іншы раз у сярэдзіне дня пачынае здавацца, што ты ўжо патраціў усе свае сілы, а трэба яшчэ дзейнічаць, думаць, прымаць рашэнні. Што ж рабіць? Добра б мець у запасе штосьці такое, што дапаможа хутка зняць стомленасць. Што гэта можа быць? Аўтатрэнінг? Ці рэлаксацыйная гімнастыка? Залежыць ад вас. Для хуткага аднаўлення працаздольнасці прыгодныя многія сродкі, але ў любых умовах самым простым, даступным і эфектыўным будзе мікрамасаж акупунктурных кропак, які вы зможаце рабіць самі, нават не распранаючыся, праз адзенне.

Мікрамасаж кропак праводзіцца адным пальцам: указальным, сярэднім ці вялікім. Вызначыўшы па нашаму апісанню і малюнку месца размяшчэння кропкі, неабходна прыкласці да яе палец і націснуць. Адзначу яшчэ, што кропка адрозніваецца па сваёй адчувальнасці ад іншых участкаў скуры — яна больш балючая. Гэтая ўласцівасць кропкі дапаможа вам пераканацца ў тым, што месца ўздзеяння выбрана правільна. Сама працэдура мікрамасажу складаецца з няхуткіх вярчальна - хістальных рухаў масіруючага пальца без яго змяшчэння па скуры, але з марудным змяненнем сілы ціску. Не трэба імкнуцца максімальна павялічваць ціск на кропку. Найбольш эфектыўным аказваецца мікрамасаж, які праводзіцца на мяжы з'яўлення болю.

Пры адшукванні кропкі, акрамя чыста анатамічнага апісання, іншы раз прыходзіцца карыстацца вымярэннем розных адлегласцей на целе. Для гэтага прымяняецца індывідуалізаваная мера даўжыні — цунь сярэдняга пальца. Адзін цунь сярэдняга пальца роўны адлегласці паміж канцамі складак, якія ўтвараюцца пры згінанні сярэдняга пальца ў другой фаланзе на левай руцэ ў мужчын і правай руцэ ў жанчын (1).

Мікрамасаж дзейсны пры любой стомленасці, без залежнасці ад прычын, што выклікалі яе. Масаж можна рабіць па некалькі разоў на дзень. Нельга праводзіць працэдуру адразу ж пасля яды ці значнай фізічнай нагрузкі. Працягласць правядзення мікрамасажу — да некалькіх мінут на кропку. Німа ніякай неабходнасці кожны раз масіраваць усе кропкі адразу, разумна выкарыстоўваць не больш 3—4 за раз. Неабходна мець на ўвазе, што эфектыўнасць кропак у чалавека бывае рознай. У кожнага з нас па-сапраўднаму будуць працаваць адна ці дзве кропкі. Якія? Гэта можна ўстанавіць толькі доследным шляхам.

Кропкі на руцэ.

Кропка 4-II, хэ-гу (2). Для выяўлення гэтай кропкі дастаткова шчыльна прыціснуць вялікі палец да ўказальнага, на вяршыні мышачнага пагорка, што пры гэтым утвараецца, і будзе знаходзіцца гэтая кропка. Яна асабліва эфектыўная пры эмацыянальным перанапружанні.

Кропка 11-II, цюй-чы (3). Для выяўлення кропкі сагніце руку ў локці пад прамым вуглом, далонню ўверх. На сярэдзіне адлегласці паміж вонкавым канцом локцевай складкі і бакавым выступам локцевага суставу знайдзіце ямку, абмежаваную ззаду і знізу, — тут і знаходзіцца кропка 11-II. Яна валодае агульнаўмацавальным дзеяннем пры стомленасці, звязанай з фізічнай працай.

Кропка 10-II, шоў-сань-лі (3), знаходзіцца на перадплечы, на краі косці з боку вялікага пальца, сярод мышцаў, ніжэй (бліжэй да косці) кропкі 11-II на два цуні. Кропка звязана з інтэлектуальнай стомленасцю. Выпраміўшы руку ў локці, далонню наперад, ад кропкі 11-II спусціцеся ўніз у напрамку да вялікага пальца рукі на два цуні. Сціснуўшы кулак, на напружаных мышцах перадплечча ў гэтым месцы вы выявіце невялікае паглыбленне. Амаль заўсёды гэтая кропка можа быць лёгка выяўлена па павышанай балючасці пры націсканні.

Кропка 5-Х, вай-гуань (3). Кропка асабліва эфектыўная пры стомленасці, звязанай з працяглым чытаннем ці работай з дысплеем. Для выяўлення кропкі, злёгку разагнуўшы руку, павярніце яе далонню ўніз, разагніце кісць і адлічыце два цуні ад месца перагібу паміж кісцю і перадплеччам. Тут, у глыбіні паміж мышцамі, і знаходзіцца кропка 5-Х.

Кропка 7-У, шэнь-мэнь (4), знаходзіцца на тыльным баку рукі, на далёкай ад кісці складцы, якая аддзяляе далонь ад перадплечча, на адну трэць даўжыні ад канца, звернутага да мізінца. Згінаючы кісць у прамянёвазапясцевым суставе, тут лёгка убачыць западзіну.

Кропкі на назе.

Кропка 36-III, цзу-сан-лі (5), знаходзіцца ў верхняй частцы галёнкі, звонку ад грабеньчыка вялікагалёначнай косці на адзін цунь, ніжэй за ніжні край каленнай чашачкі на тры цуні. Седзячы, пастаўце нагу на падлогу, не адрываючы пяткі ад падлогі, максімальна падымайце ступню. У верхняй частцы галёнкі пры гэтым з'явіцца пагорак вялікагалёначнай мышцы — на яго вяршыні неабходна правесці масаж кропкі. Кропка валодае агульнаўмацавальным дзеяннем, эфектыўная ў барацьбе са стомленасцю пасля працяглай хады. Лічыцца кропкай даўгалецця.

Кропка 39-XI, сюань-чжун (5), знаходзіцца на вонкавым баку пярэдняй паверхні нагі, вышэй за верхні край вонкавай ладыжкі на тры цуні. Для выяўлення гэтай кропкі дастаткова правесці вертыкальную лінію ўверх ад пярэдняга краю вонкавай ладыжкі па жалабку паміж мышцамі.

Кропка 6 (3)-VIII, чжао-хай (7), знаходзіцца ў западзіне ззаду за бугаркам лодкападобнай косці, ніжэй унутранай ладыжкі на паўцуня. Эфектыўная пры агульнай слабасці і павышанай стамляльнасці.

Праводзячы мікрамасаж, уважліва прыслухайцеся да сваіх адчуванняў. Звычайна кропка, якая «патрабуе» масажу, спрабуе «сігналізаваць» аб гэтым: сігналам можа быць балючасць кропкі пры націсканні, сверб, аняменне ці пачуццё распірання ці ламоты. Уважліваму чытачу нават самыя нязначныя адчуванні могуць падказаць выбар кропкі, часу і ступені ўздзеяння на яе. Калі вас будзе непакоіць кропка, намі не апісаная, звярніцеся за кансультацыяй да любога іголкатэрапеўта, ён дапаможа скласці найлепшы для вас індывідуальны рэцэпт кропак уздзеяння.



ТЭЛЕБАЧАННЕ

4 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

10.45. Ліра.
12.05. «Сакрэтны фарватэр». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. «Пунсовая кветачка». Мультфільм.
17.15. «Харазаграфічныя навелы». Фільм-канцэрт.
18.00. «Зямля Тарашкевіча». Дак. фільм.
18.30. «Праметэй». Фільм-балет.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. «Прызнанне».
19.40. Факты і меркаванні. «Пра што думаем і гаворым».
20.05. Хакей. «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Харкаў).
20.45. Калыханка.
21.00. Гандаль-дайджэст.
21.15. Абмяркоўваем праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
22.05. «Паўночны голас». Маст. фільм.
23.40. НІКа.

1 канал. Астанкіна

11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Відавочнае — неверагоднае.
12.10. Дапамажы сабе сам.
12.40. Як дабіцца поспеху.
12.55. В.-А. Моцарт. Фантазія до мінор. Выконвае С. Рыхтэр.
13.00. Блакнот.
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Сёння і тады.
14.55. «Адзіны мужчына». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.00. Дзіцячы музычны клуб.
16.40. «Лабірынт». Мультфільм.
17.00. Навіны.
17.25. Прэм'ера рубрыкі «Максіма».
17.55. Рэформа: тыдзень за тыднем.
18.40. Фільмы рэжысёра Г. Данелі. «Кін-дза-дзаі» 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Кін-дза-дзаі» 2-я серыя.
21.40. Вячэрняе музычнае кафэ «Адлюстраванне».
23.00. Навіны.
23.25. «50×50». Тэлешоу.
23.55. Чэмпіянат і кубак СНД па спартыўнай гімнастыцы.
0.25. «Адзіны мужчына». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

10.55. Тэлефільм.
11.10. Андрэй Козыраў у прэцэнтры «Рэспублікі».
12.10. «Рэйн і Волга вачамі маладых».
13.00. Весткі.
15.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
16.00. «Тусоўка: біржавы варыянт».
16.25. Асабістая думка.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Тэлеагляд «Далёкі Усход».
17.45. Прыватызацыя па-расійску.
18.00. Рэпартажы з ПАР. Перадача 2-я.
18.40. Весткі.
19.00. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў. «Дынамо» (Кіеў) — «Барселона» (Іспанія). У перапынку — Свята кожны дзень.
20.50. Тварам да Расіі.
21.10. Свет мастацтва.
22.00. Весткі.
22.20. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
22.50. Канцэрт камернай музыкі.

5 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Паўночны голас». Маст. фільм.
10.20. «Матылькі высакагор'я», «Сцежкамі запаведнымі». Дак. фільмы.
11.05. «Сакрэтны фарватэр». Маст. фільм. 3-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. Беларуская літаратура. 11-ы клас.
17.10. Запрашальны білет. Выступленне ўзорнага дзіцячага ансамбля «Калінка» г. Масквы.
18.00. «Маўклівая». Кінанарыс.
18.10. Якія мы гаспадары? Народнае прадпрыемства «Бабруйскдраў».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. «Прымірэнне». Дак. фільм.
19.50. Тыдзень беларускага ўрада.
20.05. Хакей. «Дынамо» (Мінск) — «Дынамо» (Харкаў).
20.45. Калыханка.
21.00. Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе. Студыя «КіТ».
23.25. НІКа.

1 канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Казка пра Вачо і яго мамуз». Мультфільм.
7.55. Дзіцячы музычны клуб.
8.25. Маст. фільм «Аэліта, не чапляйся да мужчын».
9.50. «Украінскія вячоркі». Фільм-канцэрт.
10.25. «Выхад». Дак. фільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
12.05. Чалавек і закон.
12.45. Фермата.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Дак. фільм «Міласэрнасць і надзея».
14.45. «Адзіны мужчына». 2-я серыя.
15.55. Фільм — дзецям. «Электронная бабуля».
17.00. Навіны.
17.25. Кенес Жандыбаеў, рэфарматар.
17.40. ...Да 16 і старэйшым.
18.20. Маст. фільм «Аэліта, не чапляйся да мужчын».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Дак. фільм «Сны наяве».
21.35. Фермата.
22.05. Былое.
23.00. Навіны.
23.25. «ВІД» прадстаўляе: «Эльдарада».
23.55. Міжнародны турнір па фул-кантакт каратэ і кікбаксінгу.
0.40. «Адзіны мужчына». 2-я серыя.

Канал «Расія»

10.00. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў. «Дынамо» (Кіеў) — «Барселона» (Іспанія).
11.30. Зусім сакрэтна.
12.20. «Ляпсус».
13.00. Весткі.
15.00. «Футбол скрозь гады». Да юбілею М. П. Старасціна.
15.45. Т. Радзіёнаў спявае рускія народныя песні.
16.00. «Хто ведае — вечнасць ці імгненне».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Калі вам за...»
17.30. Вольны час. «Увага: «адымаю!»
17.45. Парламенцкі веснік Расіі.
18.00. «У Імя сына». Перадача 2-я.
18.40. Прашу слова.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. «Сны пра Ізраіль». Фільм 1-ы.
20.30. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.55. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.25. Пятае кола. Працяг.
23.10. Фільм-канцэрт руска-амерыканскай поп-групы.

«ЖЫВЫЯ» І «МЁРТВЫЯ» КАЛІВЫ

Сёння якраз той час, калі кожны агароднік павінен праверыць свае «сусекі» з насеннем, патрэбнае — набыць. Прыгадаем, што ўсходжасць з гадамі падае. Наступае час, калі калівы ўжо не могуць крануцца ў рост.

З табліцы, што прыведзена ніжэй, відаць, які тэрмін прыгоднасці насення:

Культура	Тэрмін захоўвання (гадоў)
Гарбузы, агуркі, кабачкі, пацісоны	6—8
Гарох, фасоль, бабы	5—6
Памідоры, капуста (усіх відаў)	4—5
Рэдзька, радыска, буракі, рэпа	4—5
Морква, салата, шпінат	3—4
Пятрушка, цыбуля, перац, шчаўе, кроп	2—3
Сельдэрэй, пастарнак	1—2

У любым выпадку агароднік павінен пераканацца, ці «жывое» насенне. Для гэтага дзесяць ці больш калівы і прарошчваюцца ў вільготнай анучцы. Калі палавіна ўзышла — трэба біць трывогу. А калі карэньчыкі выкінулі, скажам, 40 працэнтаў, думаем аб замене.

ЁМІСТАСЦІ ДЛЯ РАСЛІН

Насенне можна высяваць у любую ёмістасць. А ўсё ж лепш у драўляныя скрынкі (на іх лёгка пазначаць сарты), эмаліраваныя, з пластмасы. Пазбягайце посуду, які акісляецца. Глыбіня грунту — не менш трох сантыметраў.

На донца сыплем прамыты светлы гравій, кладзём вугельчыкі, жоўтую манету. Амаль да краёў насыпаем глебу, крыху прыціскаем, лінейкай робім радкі і сеем апрацаванае насенне, перамешанае з дробным пяском. Паліваем, засыпаем прапаленым пяском. Накрываем плёнкай, ставім у цёмнае цёплае месца.

Як толькі з'явіліся першыя «разведчыкі», скрынку прыладкоўваем на яркае святло — усходнія, паўднёвыя, заходнія падаконнікі. Запомнім: недахват святла і высокая тэмпература выклічуць выцягванне раслін. У далейшым трэба сачыць, каб начныя тэмпературы былі хоць бы на 4—6 градусаў ніжэйшымі за дзённыя.

Многія майструюць белыя экраны ля вокнаў з боку пакоя, ставяць моцныя лямпы дзённага святла.

І апошняе — паліва. Вада з кранаў гарадскіх кватэр не падыходзіць. Яе давядзіце амаль да кіпення (бурбалачкі ўсплываюць), пастаўце на суткі адстойвацца, затым зліце з асадку. А найлепшая дажджавая ці снегавая вада. Можна выкарыстоўваць крынічную або калодзежную. Паспрабуйце — і вы самі пераканаецеся ў перавазе такой вады.

Матэрыялы падрыхтаваў да друку Мікалай ЧАХОЎСКІ (тэл. 32-41-92)

ГАРАЧЫ СЕЗОН НА ПАДАКОННІКАХ
ТОЛЬКІ ЗДАРОВЫЯ РАСЛІНЫ АДПЛАЦЯЦЬ УРАДЖАЕМ
А ВЫ ТАК РОБІЦЕ?
АДКАЗВАЕМ НА ПЫТАННІ ЧЫТАЧОЎ

Глеба для расады

Апошнім часам прадпрыемствы рэспублікі сталі клапаціцца пра агароднікаў, павялічваючы выпуск спецыяльных сумесей для расады. Найлепшая сярод іх — «дзвіна». У ёй верхавы торф абясшкоджаны і насычаны неабходнымі макра- і мікраэлементамі. Каранёвая сістэма раслін лёгка пранікае ў рыхлае асяроддзе.

Але каштуе гэта сумесь даволі дорага. Ды і набыць яе, як аказалася, няпроста. Многія «палюючь» за гэтай зямлёй тыднямі. Які ж тут выхад?

Ен ёсць. Зямлю для расады можна падрыхтаваць самім. Што многія і зрабілі яшчэ з восені, падрыхтаваўшы неабходную сумесь. Іншым (праспаўшым) таксама не трэба адчайвацца. На любым прадпрыемстве, у кожнай сталярнай майстэрні ёсць пілавінне. Добра любое — хваёвае і ліставое. Лепш, вядома, апошняе. Браць трэба пілавінне з дробнымі фракцыямі — амаль пытляваная мука. Выкінуць з яго стружкі і наогул буйныя камячкі, кавалачкі дрэва.

У 3—4-літровую каструлю (лепш эмаліраваную) насыпаем да краёў пілавінне, змешанае з паўшклянкай попелу. На дне да дзвюх-трох шклянак вады. Накрываем і кіпяцім, перамешваючы, да 30 мінут. За 5 мінут да заканчэння дадаць: на 2 літры сумесі 5 грамаў разведзеных у вадзе азотных угнаенняў, і ў паўтара раза больш — суперфасфатных. Астуджваем, некалькі разоў старанна перамешваем. Сумесь гатова. Яна ні ў чым не ўступае «дзвіне», вашы выхаванцы будуць шпарка набіраць разгон.

Есць і іншы «рэцэпт» глебы. Бяром дзярніну, торф і пясок, прапушчаныя праз сетку з паўсантыметровымі ячэйкамі. Суадносіны трох кампанентаў 3:1:1.

Сумесь таксама прапаліць. Можна ў духоўцы да 20—30 мінут, перамешваючы. Дадаць крыху менш паўшклянкі попелу на 2—3 кг сумесі. Можна заправіць яе 0,5 кг праваранага пілавіння. Сумесь гатова.

Звяртаем увагу агароднікаў на неабходнасць «кіпячэння» ці прапальвання сумесей. У нарыхтаванай з восені на сваім агародзе глебе ёсць узбуджальнікі розных хвароб. Іх абавязкова трэба абясшкодзіць. І высокая тэмпература ў гэтым незаменная.

Міне яшчэ колькі дзён, і можна будзе нарыхтоўваць чарназём на балотах. Асабліва добра падыходзяць краціныя хаткі-кучкі. Там, зямля рыхлая, выветраная. Усе пажыўныя рэчывы ў ёй у даступным для карэньчыкаў стане. А ўсё ж для прафілактыкі яе таксама трэба прагрэць, перамешваючы.

Сваё насенне

Усе бачаць, якія сёння чэргі за насеннем. Ды і каштуе ўсё дорага. Між тым, можна самім «гадаваць» насеннікі на прысядзібных участках і дачах. Патрэбна толькі добра угноеная, рыхлая глеба (без свежага кампосту і гною), сонца ўвесь дзень, дастатковая вільгаць. На працягу лета—дзве-тры падкормкі арганічнымі ўгнаеннямі (разам з палівам).

АГУРКІ вельмі пераапыляюцца. Скажам, «раднічок» атрымаць «чыстым» — праблема праблем. Ізаляцыя іх павінна быць не менш за 500 метраў!

Выхад — штучнае апыленне. Пядрыхтуйце некалькі парасончыкаў-каробачак, якія прапускаюць святло, але не даюць ходу пчолам, мухам, мурашкам. Да распускання на мужчынскія і жаночыя кветкі «надзеньце» гэтыя прылады. Калі кветкі раскрыюцца (першая палавіна дня), парасончыкі зніміце і пустацветам апрацуйце жаночую кветку. На адну жаночую кветку пажадана выкарыстаць два пустацветы (для стабільнасці выніку). Кветачку з маленькім агурочкам зноў прыкрыйце парасончыкам. Зніміце, калі плод пойдзе ў рост, і чакайце, пакуль выспее (50—60 дзён).

У адкрытым грунце трэба імкнуцца сеяць адзін сорт. Тады і насенне будзе больш-менш чыстае. Інакш непазбежныя гібрыды.

НАСЕННЕ ЦЫБУЛІ таксама патрабуе ізаляцыі (ад 600 да 2.000 метраў). Для пасадкі адбіраюць цыбуліны ад 5 да 7 см у дыяметры. Пажадана, каб яны былі прагрэты пры пакаёвай тэмпературы. Перад майскімі святамі адабраныя экземпляры пратручваюць, змяшчаюць на вільготную анучку, каб далі карэньчыкі. Адрэзаюць верх цыбуліны на 1 сантыметр і высаджваюць.

Калі пойдуць пяро і стрэлкі, двойчы апырскваюць 1-працэнтнай бардоскай сумессю. Убіраюць, калі з'явяцца першыя раскрытыя каробачкі. «Парасоны» зразаюць, са стрэлкамі (да 30 см), звязваюць у снопікі і сушаць на даху, на паперы ці плёнцы. Звычайна з адной расліны атрымліваюць 5 грамаў чарнушкі.

СТАЛОВЫЯ КАРАНЯПЛОДЫ — буракі, моркву, рэдзьку, пятрушку — садзяць як найраней. Глеба — тая ж, што і для іншых раслін. Часта полюць, паліваюць, рыхляць, акучваюць, даюць да трох падкормак. Для прафілактыкі апырскваюць два разы 1-працэнтнай бардоскай сумессю. Абавязкова падвязваюць стрэлкі-насеннікі. Выдаляюць пасынкі з пазухі раслін. Выспяванне насенне не адначасова. Таму ўбіраюць выбарачна. У морквы зразаюць цэнтральныя парасоны, у баракоў і пятрушкі выразаюць галінкі першага парадку. Усё дасушваецца на гарышчы.

Калі стаіць дрэннае надвор'е, расліны выдаляюць поўнасцю, дасяванне і сушку робяць пад цёплымі павецямі.

Пры захоўванні насення морквы падтрымліваюць вільготнасць 10 працэнтаў, буракоў — 14, рэдзькі — 9.

Высявайце перац

Вось і надышла пара веснавых работ. Першымі рыхтуюць для расады зярняткі салодкага і горкага перцу. Затым настае чарга памідораў.

Спачатку адбяром найбольш важкія. Гэта робіцца ў вадзе. Пустыя, пашкоджаныя адразу ўспліваюць. Насенне памідораў, капусты і радыскі лепш замочваць у растворы солі (чайная лыжка на паўлітра вады).

Усе «тапельцы» прыдатныя для сяўбы. Іх добра прамываюць і падсушваюць. Перад сяўбой — праграванне каля батарэі ці на печы (тэмпература 50—60 градусаў). Трох гадзін звычайна хапае, каб вывесці маленькія зярняткі са стану спячкі, абудзіць іх. І тут жа — замочванне. Спачатку тэмпература вады даволі высокая (да 35 градусаў), пасля — больш нізкая — да 20—25. Як найчасцей ваду трэба мяняць. Агуркі, радыску, капусту, кабачкі, гарох замочваюць на 12—18 гадзін, кроп, цыбулю, моркву, памідоры, буракі — да двух сутак.

Прарошчваюць насенне ў скрынках з пілавіннем (яны абліты кіпнем) у марлявых мяшочках. Можна ў вільготным лямцы. Тэмпература — 20—25 градусаў.

Праграванне сумяшчаюць з загартоўкай, калі набухлыя калівы (асобныя ўжо выкінулі кволыя парасткі) выносяць на балкон, змяшчаюць у халадзільнік (з тэмпературай 0°), закопваюць у снег. Уначы такое насенне загартоўваецца, а як наступае дзень, яго ўносяць у цёплае памяшканне. І так ад пяці да дзесяці сутак.

На адным з этапаў замочвання насенне варта змясціць у слабы раствор мікраэлементаў (можна выкарыстаць слабы настой попелу).

Прарошчанае насенне абавязкова высяецца ў вільготную глебу. Інакш парасткі загінуць.

Гумус здабываецца працай

У газетах часта ўпамінаецца слова гумус. Што яно абазначае?

А. КАЗАЧЭНКА.

г. Магілёў.

Лацінскае слова гумус абазначае зусім празаічнае: глеба, зямля. Агароднікі разумеюць пад гэтым паняццем перагной, чарназём — наогул букет часцінак глебы цёмнага, цёмна-шэрага колеру. Утвараецца з рэшткаў раслін, гною ў выніку складаных біяхімічных працэсаў. Чым лепшыя цеплавыя ўмовы, больш дасканалыя аэрацыя і вільготнасць, рэакцыя глебавага раствору, тым больш інтэнсіўна назапашваецца гумус.

У гумусе прысутнічаюць усе элементы сілкавання: азот, фосфар, калій, кальцый, жалеза, сера і іншыя. Але многія з іх знаходзяцца ў недаступнай для раслін форме. Мікраарганізмы за вясну, лета і восень «вызваляюць» каштоўныя для развіцця раслін рэчывы, падаюць іх да карэньчыкаў. У гэтым сэнсе гумус — кладоўка ўрадлівасці глебы. Ад яго напрамую залежаць водны, паветраны яе рэжымы, структура і біялагічная актыўнасць.

Калі ў глебе да 20 працэнтаў гумусу, яна лічыцца багатай. Гэта ў асноўным чарназёмы, акультураныя на працягу дзесяцігоддзяў сялянскія агароды і дачныя ўчасткі. У іншых глебах гумусу менш. У шэрай лясной зямлі, напрыклад, яго ўсяго да дзевяці працэнтаў, дзярнова-падзолістай — шэсць, падзолістай — усяго два. Каб палепшыць апошнюю, трэба ўносіць шмат арганікі, нават завозіць чарназём і торф, прапускаючы іх праз кампосты.

Згадаем, што ў лесе, напрыклад, за два дзесяцігоддзі з шыгалля, лісця, травы, галінак і шмат чаго іншага ўтвараецца вельмі тонкі чорны ці шэры слой — усяго ў некалькі міліметраў. Як жа беражліва трэба ставіцца да яго, каб захаваць, памножыць!

РАДЫЁ

5 сакавіка

8.15 — «Вясковыя ростані». 9.15 — «Шчырасць сэрца». Да 90-годдзя з дня нараджэння жывапісца П. Гаўрыленкі. 10.15 — для дзяцей. У. Ягоўдзік. «Усміхнёся, прынцэса!». Радыёпастаноўка. Частка 1-я. 11.00 — «Ваша думка, ваша прапанова». 11.30 — «Чалавек. Грамадства. Закон». Радыёчасопіс. 12.00 — «Апоўдні». 13.00 — «У абедзенны перапынак». 14.00 — канцэрт. 15.15 — А. Шэлег. «Рэха баравое». Радыёспектакль. 16.05 — «Радыёпошук». 16.35 — «Ручаінка». 17.00 — «Эканамічны дзённік». 17.40 — «Ад нашага ўласнага карэспандэнта». 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — вячэрняя казка. 20.00 — «Дзень нашага жыцця». 20.25 — М. Гусаўскі. «Песня пра зубра». Старонкі паэмы. 21.00 — «Ад шчырага сэрца». Музычная праграма. 22.00 — «Служба — дні і ночы». 22.30 — танцавальная праграма. 23.10 — канцэртная праграма.

НА ДВОР'Е

4 сакавіка

Сёння ўдзень па рэспубліцы воблачнае з праясненнямі надвор'е, кароткачасовыя ападкі пераважна ў выглядзе снегу. Вецер паўночна-заходні, парывісты. Тэмпература паветра ў Брэсце — 3—5, Гродна, Мінску і Гомелі — 2—4, Віцебску — 1—3 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак: 5 сакавіка па ўсходу рэспублікі кароткачасовы снег, 6-га ў асноўным без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да 5, пры праясненнях да 10 градусаў марозу, удзень 1—6 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ СЁННЯ Ў НУМАРЫ

«Люстэрка». Аператыўная інфармацыя. Факты. Меркаванні. Каментарыі да пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб дадатковых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва ў сувязі з лібералізацыяй цэн».

Пункт гледжання. **«Не магу маўчаць».**

Рэферэндум «за» і «супраць». **«Сем разоў адмерай...»** — раіць кандыдат эканамічных навук Валерый Дашкевіч.

«На парозе банкрутства знаходзіцца сёння спажывецкая кааперацыя рэспублікі». Артыкул С. Мільштэйна, кандыдата эканамічных навук.

Канфліктная сітуацыя. **«Іск з «таго свету».**

Трывожны сімптом. **«Прыхватызацыя» па-каўказску».**

«Пасрэдзнік». Інфармацыйна-рэкламны раздзел.

«Вернісаж праз акіян». У Мінску адкрылася выстаўка грамадзянкі ЗША Галіны Русак.

ДА ЎВАГІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ!

Кафедра вылічальнай тэхнікі і арэндны цэнтр Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі запрашаюць на двухтыднёвыя курсы «ПРЫМЯНЕННЕ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ЭВМ У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ».

У час навучання пачынаючыя карыстальнікі набудуць навыкі практычнай работы з сервіснымі абалонкамі і антывірусными праграмамі, тэкставым рэдактарам, пакетамі прыкладных праграм па аўтаматызацыі рабочых месц спецыялістаў сельскагаспадарчай вытворчасці.

Камплектаванне груп па мерах паступлення заявак і аплаты навучання.

НАШ АДРАС: 220608, г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 99, кор. 1, кафедра вылічальнай тэхнікі.

Тэлефон для даведак: 64-62-37 (8-0172).

МЯНЯЮ КВАТЭРУ

Крым, пасёлак Новаазёрнае, побач мора, непадалёк ад Еўпаторыі, 46 кв. м, ёсць прысядзібны ўчастак 6 сотак на раўнацэнную ў Мінску. Званіць ў Мінску па тэл. 23-71-79.

Адна з самых распаўсюджаных хвароб, якой пераважна пакутуюць людзі старэйшыя за 25 гадоў.

Гемарой

ПРЫКМЕТЫ. Спачатку адчуваецца нязручнасць у вобласці задняга праходу, іншы раз з'яўляюцца кароткачасовыя болі. Затым са стулам пачынае выдзяляцца пунсовая кроў (на паверхні калавых мас). Пазней кроў выдзяляецца як у час, так і пасля апраўкі. У некаторых хворых узнікае пастаянны крывацёк, які абяскроўлівае арганізм.

Калі гемараідальныя вузлы запаляюцца, хворыя пачынаюць скардзіцца на болі, адчуванне пякучасці і цяжкасці ў заднім праходзе, якое ўзмацняецца пры атручэннях. Яны прымаюць вымушанае становішча: кладуцца на бок, жывот, садзяцца на адну ягадзіцу. Скура вакол задняга праходу чырванее і ацякае. Вузлы робяцца цвёрдымі і пачынаюць балець.

Калі запалёныя гемараідальныя вузлы трапляюць на паверхню, яны ўшчамляюцца ў заднім праходзе, а затым і трамбуюцца. Болі робяцца значна мацнейшымі (асабліва ў час апраўкі, хадзьбы і сядзення). Павышаецца тэмпература цела, іншы раз парушаецца мочаспусканне. Гемараідальныя вузлы, што выпалі на паверхню і ўшчаміліся, рэзка павялічаныя, напружаныя, сіне-барвовыя, вельмі баляць. Тканкі, што іх акружаюць, ацёчныя, скура чырвоная.

У некаторых хворых з гемараідальных вузлоў можа развівацца вострае запаленне, якое суправаджаецца іх амярцвеннем. У такіх выпадках болі носяць нясцерпны і пастаянны характар і аддаюцца ў ягадзіцы, прамежнасць, а іншы раз у ніз жывата. Яны могуць суправаджацца дрыжыкамі. Хворыя не могуць хадзіць і сядзець.

АКАЗАННЕ ДАПАМОГІ. Трэба абмежаваць рухомую актыўнасць, а пры рэзкіх болях легчы ў ложак. Раніцай і вечарам уводзіць у прамую кішку свечкі з антыпірынам, трыпсінам, гепарынам. Не імкнуцца запраўляць вельмі запалёныя выпаўшыя гемараідальныя вузлы. На іх трэба налажыць павязку з сінтаміцынавай эмульсіяй. Прымаць унутр анальгін (па 1 таблетцы 3 разы ў дзень), а на ноч — снатворнае. Неабходна ўключыць у харчаванне прадукты, якія валодаюць слабіцельным дзеяннем (асабліва агародніну і садавіну). Нельга прымаць алкагольныя напіткі і есці раздражняльныя прадукты. Трэба акуратна праводзіць туалет, выкарыстоўваючы пры гэтым душ.

Пры абвастрэнні гемарою для ліквідацыі запалення і рэгуляцыі акта дэфекацыі прымяняюць ачышчальныя клізмы, ставяць свечкі з анестэзінам, наваканнам. Можна рабіць мікраклізмы з вазелінам, абляпіхавым маслам ці маслам шыпшыны, прыкладваць да прамежнасці павязкі з маззю Вішнеўскага, прымаць сродкі для абязбольвання. Такое лячэнне часта бывае дастатковым.

У выпадку ўскладнення хваробы (асабліва пры ўшчамленні выпаўшых гемараідальных вузлоў), трэба прылажыць холад да прамежнасці, налажыць на гэтую вобласць мазевую павязку, прыняць унутр амідапірын з анальгінам і тэрмінова выклікаць урача ці «хуткую дапамогу».

У сувязі з тым, што часта пад выглядам гемарою развіваецца пухліна прамой кішкі, хвораму незалежна ад цяжкасці хваробы патрэбна наведаць хірурга.

М. БАТВІНКОЎ,
прафесар.

г. Гродна.

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: намеснік рэдактара Міха